Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел бібліятэказнаўства

БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Віцебск
2015

УДК 027
ББК 78.34(4Беи-4Вит)
Б67

Складальнік *Н. А. Пугачова*
Рэдакцыйная калегія:
В. М. Камендантава (адказ. рэд.), А. М. Васілеўская
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. Н. А. Пугачова]. – Віцебск, 2015. – 43 с.

У штогадовым выданні прадстаўлены агляды дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна і публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці за 2014 год.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2015

БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Складальнік **Пугачова** Наталля Аляксандраўна
Адказны за выпуск Т.М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А.В. Юпатавай
Мастацкае афармленне А.В. Юпатавай

Тыраж 12 экз.
Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»
210601 г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: vlib@vlib.by

Табліца № 6

ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ Ў 2014 ГОДЗЕ

ЦБС	2013 Выканана паслуг (млн. руб.)	2014 Колькасць паслуг	2014 План	2014 Выканана паслуг (млн. руб.)
Аршанская	190,0	38	247,0	193,0
Бешанковіцкая	77,3	67	95,5	93,6
Браслаўская	70,8	37	99,2	99,5
Верхнядзвінская	37,0	33	51,7	37,3
Віцебская	52,2	24	45,0	47,1
Глыбоцкая	69,6	19	90,6	85,1
Гарадоцкая	48,0	32	57,6	40,5
Докшыцкая	59,4	38	72,0	72,5
Дубровенская	43,8	41	58,0	46,0
Лепельская	76,2	47	100,7	80,6
Лёзненская	20,3	29	24,0	17,2
Міёрская	51,4	49	62,0	65,3
Полацкая	147,2	43		148,7
Пастаўская	72,6	17	105,0	72,1
Расонская	33,3	19	50,0	47,8
Сенненская	67,3	27	75,0	77,6
Талачынская	49,2	21	70,0	60,6
Ушацкая	54,0	38	78,5	72,6
Чашніцкая	70,2	41	80,0	80,7
Шаркаўшчынская	29,0	24	40,8	36,1
Шумілінская	33,0	34	45,0	46,9
Усяго па РЦБС	**1351,8**	**718**	**1547,6**	**1520,8**
г. Віцебск	103,0	54	109,0	100,0
г. Наваполацк	158,1	60	220,8	155,8
Усяго па ГЦБС	**261,1**	**114**	**1877,4**	**255,8**
Усяго па ЦБС	**1612,9**	**832**	**3425,0**	**1776,6**
Абласная б-ка	99,9	20	139,8	120,7
Усяго	**1712,8**	**852**	**3564,8**	**1897,3**

ЗМЕСТ

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА Ў 2014 ГОДЗЕ
Камендантава В.М. *– намеснік дырэктара Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна* 4

ПУБЛІЧНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ
Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАСТОРЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ
Пугачова Н.А. *– загадчык аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна* 14

РАБОТА БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ З ДЗЕЦЬМІ І ПАДЛЕТКАМІ
Сёмкін А.І. *– вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна* 24

МЕТАДЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК
Мелькіна Н.А. *– галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*..... 28

АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ПЦПІ
ПА ФАРМІРАВАННІ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ РЭГІЁНА
Пугачова Н.А. *– загадчык аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна* 30

КЛУБЫ ПА ІНТАРЭСАХ І АМАТАРСКІЯ АБ'ЯДНАННІ
Васілеўская А.М. *– галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна* 34

ДАДАТКІ
Табліца № 1. Сетка публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2014 годзе..... 37
Табліца № 2. Паказчыкі дзейнасці інтэграваных бібліятэк 38
Табліца № 3. Асноўныя паказчыкі дзейнасці бібліятэк 39
Табліца № 4. Стан бібліятэчных фондаў 40
Табліца № 5. Аўтаматызацыя бібліятэк вобласці 41
Табліца № 6. Платныя паслугі 42

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА Ў 2014 ГОДЗЕ

Камендантава В.М.,
намеснік дырэктара
Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна

У 2014 годзе аддзеламі абслугоўвання бібліятэкі абслужана **48 236** непасрэдных і **32** аддаленых карыстальнікі. З агульнай колькасці непасрэдных чытачоў дзеці ва ўзросце да 15 гадоў склалі **4 188.** За справаздачны год выдана **942 634** экзэмпляраў бібліятэчных дакументаў. Сярэдняя выдача дакументаў у дзень – 3 217 экзэмпляраў. Непасрэдныя наведванні па бібліятэцы склалі **233 198**. Разам з тым, колькасць віртуальных наведванняў на афіцыйны сайт бібліятэкі, на якім размешчаны значныя ўласныя бібліятэчныя рэсурсы (электронны каталог, базы даных, электронныя версіі друкаваных выданняў), склала **700 485** наведванняў. Чытальнасць – **19,5** (19,9 у 2013 г.), наведвальнасць – **4,8** (4,7 у 2013 г.), абарачальнасць фонду – **1,3** (1,4 у 2013 г.).

На камплектаванне бібліятэчнага фонду зрасходавана **1 783,1** млн. рублёў бюджэтных сродкаў. У тым ліку: на кнігі – 1034,8 млн. руб. (у 2013 годзе – 933,2 млн. руб.) і перыядычныя выданні – 748,3 млн. руб. (у 2013 годзе – 486,6 млн. руб.). Усяго ў фонд бібліятэкі было набыта **16 514** экз. дакументаў. У тым ліку за бюджэтныя сродкі – 15 542 экз. дакументаў, за пазабюджэтныя – 117 экз. кніг. Пазабюджэтныя выдаткі на набыццё літаратуры склалі 10,7 млн. рублёў. Паказчык ад агульнага бюджэту на камплектаванне склаў 16,6 % (у 2013 годзе – 15,0 %). У фонд паступіла 9097 экз. кніг, што на 855 экз. больш, чым у 2013 годзе.

Сацыяльна значных выданняў набыта 146 экз. на суму 13,7 млн. рублёў, агучаных дакументаў – 90 экз. на суму 8,7 млн. рублёў, электронных выданняў – 51 экз. на суму 4,1 млн. рублёў. Кніг беларускіх выдавецтваў, у тым ліку на беларускай мове, набыта 3 872 экз. (23,4 % ад агульнай колькасці дакументаў).

На канец справаздачнага года фонд бібліятэкі склаў 704 558 экзэмпляраў. У параўнанні з 2013 годам ён зменшыўся на 12 122 экз. Працэнт абнаўлення фонду за 2014 год склаў 2,3 %.

Па стане на 01.01.2015 парк ПК бібліятэкі складае **116** адзінак. Функцыяніруюць 25 прынтараў (7 матрычных, 18 лазерных), 6 шматфункцыянальных прылад, 6 сканераў, 53 прыборы бесперапыннага сілкавання. У лакальную сетку аб'яднаны 109 камп'ютараў. У 2014 годзе набыты 2 камп'ютары, ламінатар, сканер і 3 шматфункцыянальныя прылады.

На працягу года аддзелам аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў ажыццяўлялася суправаджэнне комплексу праграм бібліятэчнай сістэмы ALIS-WEB, праведзена значная работа па ўдасканаленні веб-сайта бібліятэкі: распрацаваны тэматычныя банеры: «2014 – Год гостеприимства», «Стваральнік ваеннай эпапеі» (да 90-годдзя з дня

Табліца № 5

АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭК ВОБЛАСЦІ

ЦБС	Камп. б-к	Колькасць камп. 2013 год	Колькасць камп. 2014 год	Доступ да сеткі Інтэрнэт	Сайт	Электрон. адрас	Колькасць АРМ для карыст.	Модуль АБІС Абслуг. чытачоў
Аршанская	22	82	86	10	orcbs.ucoz.ru	10	28	6
Бешанковіцкая	11	21	23	9	beshenkovichicbs.by	6	13	1
Браслаўская	22	34	36	10	0	10	23	3
Верхнядзвінская	12	19	22	7	0	6	0	1
Віцебская	20	31	30	20	bibliovitebsk.by	20	21	1
Глыбоцкая	16	34	35	15	cbs.okglub.by	15	6	1
Гарадоцкая	13	23	28	11	gcb.vitebsk.net	11	18	1
Докшыцкая	14	16	20	9	dokshici.far.ru	9	14	1
Дубровенская	15	29	30	14	0	14	15	1
Лепельская	14	28	31	13	lepelcbs.vtb.by	13	14	1
Лёзненская	16	22	28	14	lioznolib.ucoz.ru	14	17	1
Міёрская	14	20	25	11	miory-biblioteka.by	11	14	1
Полацкая	30	84	81	24	skorina-lib.by	24	16	2
Пастаўская	14	23	25	11	poslib.blogpost.com	11	2	1
Расонская	11	17	18	5	biblros.by	5	12	1
Сенненская	14	20	22	10	cbs-senno.by	9	14	1
Талачынская	13	18	18	4	tolochincbs.by	4	13	0
Ушацкая	10	17	17	7	0	7	1	1
Чашніцкая	20	41	47	19	chashnikicbs.zz.mu	17	14	2
Шаркаўшчынская	10	18	17	9	scharcbs.jimdo.com	9	11	1
Шумілінская	12	23	23	8	shumilinocbs.narod2.ru	8	14	1
Усяго па РЦБС	**323**	**620**	**662**	**240**	**17**	**233**	**280**	**29**
г. Віцебск	12	109	115	4	cbsvit.by	4	32	1
г. Наваполацк	7	51	62	7	novopolotsk-lib.iatp.by	7	6	4
Усяго па ГЦБС	**19**	**160**	**177**	**11**	**2**	**11**	**38**	**5**
Усяго па ЦБС	**342**	**780**	**839**	**251**	**19**	**244**	**318**	**34**
Абласная б-ка	1	128	116	1	vlib.by	1	26	1
Усяго	**343**	**908**	**955**	**252**	**20**	**245**	**344**	**35**

Табліца № 4

СТАН БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ

ЦБС	Бібл.фонд 01.01.2014	Бібл.фонд 01.01.2015	Паступіла усяго (экз.)	Паступіла сац. значымай (экз.)	Паступіла сац. значымай (млн.)	Выбыла усяго (экз.)		% абнаўлення фонда	% выканан. нарматыва фінанс. на камп-не
Аршанская	739 203	748 149	30 161	2 140	118,9	21 215	4,0	16,9	
Бешанковіцкая	232 067	206 433	11 846	258	9,9	37 480	5,7	15,7	
Браслаўская	288 685	258 376	14 552	1 740	69,1	44 861	5,6	15,9	
Верхнядзвінская	270 157	261 660	11 301	1 286	87,5	19 798	4,3	16,2	
Віцебская	422 589	410 300	13 160	822	48,3	25 449	3,2	15,7	
Глыбоцкая	372 910	337 856	17 120	796	52,1	52 174	5,1	15,3	
Гарадоцкая	283 632	249 837	15 862	544	37,3	49 657	6,3	16,1	
Докшыцкая	281 390	266 848	15 841	1 030	56,1	30 383	5,9	15,5	
Дубровенская	277 790	266 155	15 527	736	40,1	27 162	5,8	15,6	
Лепельская	225 038	215 600	20 776	448	27,7	30 214	9,6	16,7	
Лёзненская	198 106	171 858	10 301	158	5,3	36 549	6,0	16,0	
Міёрская	270 521	234 478	13 350	636	44,4	49 393	5,7	16,4	
Полацкая	583 947	571 902	32 060	949	69,3	44 105	5,6	15,4	
Пастаўская	282 763	260 947	10 977	464	40,8	32 793	4,2	15,8	
Расонская	168 226	163 263	7 736	558	28,5	12 699	4,7	15,4	
Сенненская	289 329	268 752	11 526	797	44,2	32 103	4,3	15,8	
Талачынская	249 514	203 705	10 118	1 196	70,1	55 927	5,0	15,6	
Ушацкая	202 810	194 839	7 638	696	42,8	15 609	3,9	14,8	
Чашніцкая	350 175	328 789	25 410	1 833	45,1	46 796	7,7	15,3	
Шаркаўшчынская	201 663	194 627	8 326	180	7,4	15 362	4,3	13,9	
Шумілінская	181 608	170 384	12 409	420	23,2	23 633	7,3	15,6	
Усяго па РЦБС	**6 372 123**	**5 984 758**	**315 997**	**17 687**	**968,1**	**703 362**	**5,3**	**15,8**	
г. Віцебск	871 118	874 024	25 762	1 050	103,6	22 856	2,9	11,8	
г. Наваполацк	453 091	448 525	16 701	2 230	126,0	21 267	3,7	15,5	
Усяго па ГЦБС	**1 324 209**	**1 322 549**	**42 463**	**3 280**	**229,6**	**44 123**	3,2	**13,2**	
Усяго па ЦБС	**7 696 332**	**7 307 307**	**358 460**	**20 967**	**1 197,7**	**747 485**	4,9	**14,5**	
Абласная б-ка	716 680	704 558	16 514	146	13,7	28 636	2,3	16,6	
Усяго	**8 413 012**	**8 011 865**	**374 974**	**21 113**	**1 211,4**	**776 121**	4,7	**15,4**	

нараджэння В. Быкава), «Чтение без границ» (бібліятэчнае абслугоўванне невідушчых і чытачоў з аслабленым зрокам), «Звучит оркестра песнь златая» (творчая дзейнасць кіраўніка і дырыжора аркестра народных інструментаў І.Я. Ласкутова); выканана графічнае афармленне электронных выстаў (19); распрацавана і аператыўна напаўнялася інтэрнэт-старонка аддзела дзіцячай літаратуры.

Мэтанакіравана праводзілася работа па далучэнні карыстальнікаў да вывучэння нацыянальнай гісторыі, культуры, літаратуры. Гэтаму спрыялі комплексныя кніжна-ілюстрацыйныя выставы, тэматычныя падборкі: «Беларусь непаўторная», «Добры дзень, беларуская кніга», «Таямніцы беларускай гісторыі», «Гісторыя Беларусі: імёны і падзеі», «Голасам душы і сэрца» (Віцебшчына літаратурная), «Сусветная літаратура ў перакладзе на беларускую мову» (21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы), «Свята славянскай культуры» (фестываль Славянскі базар у Віцебску). Адзначылі выставамі юбілейныя даты беларускіх майстроў слова: Васіля Хомчанкі, Івана Капыловіча, Аркадзя Куляшова, Еўдакіі Лось, Васіля Быкава, Івана Чыгрынава.

7 чэрвеня ў бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з беларускай паэтэсай, пісьменніцай, журналісткай, літаратурным крытыкам Л.І. Рублеўскай. Людміла Іванаўна расказала пра сваю сумесную працу з гісторыкам, літаратуразнаўцам В. Скалабанам, вынікам якой стала выданне кнігі «Время и бремя архивов и имен». Прысутныя на сустрэчы маглі азнаёміцца з творамі Людмілы Рублеўскай на выставе «Мы вернемся на Беларусь…».

7 кастрычніка ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя зборніка навуковых паведамленняў «Исторический календарь мини-проектов “Падбярэзскі куфар”». Матэрыялы зборніка ўключаюць даследаванні гісторыка-культурнай і эканамічнай спадчыны вёскі Падбярэззе Віцебскага раёна, закранаюць пытанні развіцця аграэкатурызму ў рэгіёне. У навукова-даследчай рабоце ўдзельнічалі гісторыкі, архівісты, краязнаўцы, мастакі, інтэлігенцыя вёскі. Па матэрыялах, сабраных у выніку рэалізацыі праекта, адбылася навуковая канферэнцыя.

Справаздачны год быў адзначаны для бібліятэкі актывізацыяй сумеснай дзейнасці з ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Так, у верасні ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі «Встреча» паэтэсы, лаўрэата Усерасійскай літаратурнай прэміі, старшыні Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Т.І. Красновай-Гусачэнкі, на якой прагучалі вершы, як новыя, так і ўжо добра вядомыя.

Чытачы змаглі сустрэцца з дзіцячым пісьменнікам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі С.А. Трафімавым, які прыехаў з г. Оршы на мерапрыемства з выхаванцамі Вялікалятчанскага дзіцячага дома, а пасля яго заканчэння наведаў хлопчыкаў і дзяўчынак, якія знаходзяцца на лячэнні ў Віцебскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы.

5 чэрвеня ў бібліятэцы адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны А.С. Пушкіну і прымеркаваны да 215-годдзя з дня нараджэння паэта. Цэнтральнай падзеяй мерапрыемства стала прэзентацыя факсімільнага

выдання з фонду абласной бібліятэкі «А.С. Пушкин. Болдинские рукописи 1830». У арганізацыі і правядзенні вечарыны прынялі ўдзел старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Т. Краснова-Гусачэнка, паэты А. Крыклівец і У. Крайнеў. Юбілейнае мерапрыемства завяршылася ля помніка А.С. Пушкіну, дзе для аматараў мастацкага слова было арганізавана свята паэзіі.

Шэраг сацыякультурных мерапрыемстваў у мінулым годзе быў прысвечаны віцебскім літаратарам. Так, 12 чэрвеня прайшоў вечар памяці паэта Давіда Сімановіча і прэзентацыя яго апошняга зборніка «Дней разорванные звенья», які аўтар не паспеў прадставіць чытачам пры жыцці. Выданне прэзентаваў пісьменнік, журналіст С.В. Рублеўскі. Увазе прысутных была прапанавана персанальная кніжная выстава, на якой была прадстаўлена творчая спадчына паэта, альбом з яго фотаздымкамі, бібліяграфічныя паказальнікі, выдадзеныя да юбілейных дат жыцця і творчасці.

У лістападзе прайшла прэзентацыя кнігі «Юшка Вялеса» журналісткі, краязнаўцы, пісьменніцы С.У. Гук (Дзядзінкінай). Гэта другі твор аўтара ў серыі «Скарбы роднай прыроды» і прысвечаны легендам і гісторыі Браслаўшчыны, яе прыроднай спадчыне.

16 снежня ў аддзеле краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі адбыўся вечар-успамін «Святло душы аддаўшы людзям», прымеркаваны да 75-годдзя з дня нараджэння паэта, перакладчыка, педагога Анатоля Мікалаевіча Канапелькі.

Гісторыка-патрыятычнае выхаванне з'яўлялася адным з важнейшых напрамкаў работы бібліятэкі ў мінулым годзе. Яго галоўнымі мэтамі было развіццё грамадзянскасці і патрыятызму, як найважнейшых духоўна-маральных і сацыяльных каштоўнасцяў.

15 лютага на сайце бібліятэкі быў актываваны электронны рэсурс «Афганистан. Без права на забвение», створаны да 25-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана і прысвечаны воінам-інтэрнацыяналістам Віцебшчыны. Рэсурс уяўляе сабой камбінаваную базу даных і з'яўляецца вынікам рэалізацыі сумеснага праекта ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», Віцебскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», Віцебскага гарадскога музея воінаў-інтэрнацыяналістаў. Пры падрыхтоўцы базы даных выкарыстаны паўнатэкставыя матэрыялы, фотадакументы з фондаў удзельнікаў праекта, а таксама асабістых архіваў воінаў-афганцаў. Персаніфікаваныя звесткі пра воінаў-афганцаў прадастаўлены раённымі ваеннымі камісарыятамі Віцебскай вобласці і Віцебскім аб'яднаным гарадскім ваенным камісарыятам.

У 2014 годзе адзначалася 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, таму у выставачнай дзейнасці бібліятэкі значная ўвага надзялялася юбілейным і памятным датам Вялікай Айчыннай вайны. Аддзел перыядычнай літаратуры распрацаваў і прадставіў увазе карыстальнікаў цыкл выстаў «Хроника. События. Люди», у які ўвайшлі экспазіцыі: «Великая Отечественная война в современной

Табліца № 3

АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2014 ГОДЗЕ

ЦБС	Сетка 2014	Колькасць чытачоў	Выдача	Фонд	Наведванні	Чытальнасць	Абарачальнасць	Наведвальнасць	Кнігазабяспечанасць
Бешанковіцкая	17	10 990	233 973	206 433	93 383	21,29	1,13	8,50	18,78
Браслаўская	28	17 470	361 288	258 376	154 250	20,68	1,40	8,83	14,79
Верхнядзвінская	20	12 640	230 501	261 660	168 427	18,24	0,88	13,32	20,70
Віцебская	28	21 322	446 899	410 300	78 970	20,96	1,09	3,70	19,24
Глыбоцкая	27	22 755	420 729	337 856	159 556	18,49	1,25	7,01	14,85
Гарадоцкая	26	14 954	291 382	249 837	143 605	19,49	1,17	9,60	16,71
Докшыцкая	28	15 089	293 018	266 848	131 211	19,42	1,10	8,70	17,68
Дубровенская	22	10 518	209 880	266 155	82 839	19,95	0,79	7,88	25,30
Лепельская	20	15 647	362 623	215 600	109 634	23,18	1,68	7,01	13,78
Лёзненская	16	11 949	231 283	171 858	112 785	19,36	1,35	9,44	14,38
Міёрская	25	12 225	231 168	234 478	92 492	18,91	0,99	7,57	19,18
Аршанская	45	49 929	1 006 146	748 149	341 701	20,15	1,34	6,84	14,98
Полацкая	35	47 030	852 718	571 902	326 584	18,13	1,49	6,94	12,16
Пастаўская	28	17 859	341 253	260 947	147 472	19,11	1,31	8,26	14,61
Расонская	14	6 632	143 492	163 263	51 230	21,64	0,88	7,72	24,62
Сенненская	22	15 917	321 896	268 752	122 989	20,22	1,20	7,73	16,88
Талачынская	20	13 209	238 535	203 705	85 072	18,06	1,17	6,44	15,42
Ушацкая	19	10 192	191 039	194 839	69 082	18,74	0,98	6,78	19,12
Чашніцкая	20	24 265	523 443	328 789	176 799	21,57	1,59	7,29	13,55
Шаркаўшчынская	21	10 260	190 987	194 627	76 321	18,61	0,98	7,44	18,97
Шумілінская	22	14 452	306 323	170 384	129 248	21,20	1,80	8,94	11,79
Усяго па РЦБС	**503**	**375 304**	**7 428 576**	**5 984 758**	**2 853 650**	**19,79**	**1,24**	**7,60**	**15,95**
г. Наваполацк	7	30 840	626 742	448 525	225 084	20,32	1,40	7,30	14,54
г. Віцебск	21	95 385	1 723 526	874 024	696 050	18,07	1,97	7,30	9,16
Усяго па ГЦБС	**28**	**126225**	**2 350 268**	**1 322 549**	**921 134**	18,62	1,78	7,30	10,48
Усяго па ЦБС	**531**	**501529**	**9 778 844**	**7 307 307**	**3 774 784**	**19,50**	**1,34**	**7,53**	**14,57**
Абл. бібліятэка	1	48 268	942 634	704 558	933 683	19,53	1,34	19,34	14,60
Усяго	**532**	**549797**	**10721478**	**8011865**	**4708467**	**19,50**	**1,34**	**8,56**	**14,57**
Да 2013 г.	-68	-21 425	-391 994	-401 147	(+634298)	19,46	1,32	7,13	14,72

Табліца № 2

ПАКАЗЧЫКІ ДЗЕЙНАСЦІ ІНТЭГРАВАНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2014 ГОДЗЕ

Раён	Назва аб'ядноенай бібліятэкі	Год аб'яд.	Фонд (усяго)	Новыя паступл.	Кн/выдача	Наведв.	Карыст.	Да 15 год	Мерапр.	Насельн. у зоне абслуг.
Браслаўскі	Далёкаўская б/ф № 45	2012	7660	428	6370	2463	264	26	62	399
	Мяжанская б/ф № 59	2012	7701	481	6805	2730	244	59	64	355
	Дрысвяцкая б/ф № 52	2014	5045	1444	8351	3236	213	64	48	353
	Гіраўшанская б/ф № 53	2014	4680	1014	5041	2191	226	42	52	380
Гарадоцкі	Стадолішчанская с/б	2014	5228	378	4005	2019	200	45	12	259
	Вайханская с/б	2014	6215	328	3301	1343	170	42	26	200
Докшыцкі	Замосточская с/б	2013	5419	666	4271	1378	120	45	14	435
	Вітуніская с/б	2013	6251	305	4147	1836	321	108	39	369
Дубровенскі	Засценкаўская с/б	2013	7 387	341	2 955	1 245	142	22	17	157
	Лякаўская с/б	2014	4 265	614			29	7	3	251
Лепельскі	Матырынская с/б	2013	9 146	460	7004	2926	340	59	14	454
	Горская с/б	2014	8 094	1428	8224	2593	321	123	23	429
	Пышнянская с/б	2014	5466	1097	5758	1991	270	42	65	397
Міёрскі	Пашуляўская с/б	2013	6341	310	5867	1695	252	43	9	326
	Дрыгучская с/б	2013	5440	242	5140	1974	253	55	7	364
Полацкі	Дрэтуньская б/ф № 36	2013	3680	284	6420	2099	301	47	34	262
	Начская б/ф № 38	2013	3688	354	4802	3290	265	43	29	402
Расонскі	Заборская с/б	2014	13277	448	6372	2233	318	34	12	451
Ушацкі	Дуброўская б/ф № 9	2013	10586	259	5261	1802	322	45	51	500
	Кубліцкая б/ф № 15 імя В.Быкава	2014	7935	419	8401	2741	292	46	55	650
Шумілінскі	Суровенская с/б	2013	8053	398	5832	2113	250	44	27	378
УСЯГО			**141557**	**11698**	**114327**	**43898**	**5113**	**1041**	**663**	**7771**

прозе и поэзии», «Праз горы страт да Перамогі», «Так начиналась война», «Историческая память народа: из прошлого в будущее». У аддзелах абслугоўвання быў прадстаўлены цэлы шэраг выстаў ваеннай тэматыкі: «О подвиге твоем, Ленинград!» (да дня зняцця блакады Ленінграда, 1944 г.), «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Жить, помнить, беречь мир» (11 красавіка – Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў), «Беларусь гераічная мая», «Через века, через года – помните» (22 чэрвеня – Дзень памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны) і інш.

15 красавіка ў аддзеле перыядычнай літаратуры адбылася творчая сустрэча з расійскім гісторыкам-архівістам, пісьменнікам, аўтарам больш за трыццаць манаграфій А.А. Чарояміным. На сустрэчу з ім прыйшлі гісторыкі, архіўныя і музейныя работнікі, бібліятэкары і студэнты. У рамках мерапрыемства прайшла прэзентацыя кніг А.А. Чарояміна «Правда о Великой Отечественной войне. Из истории 349-й стрелковой дивизии (1941–1945 годы)» і «Правда о Великой Отечественной войне. Из истории 123-го Днепропетровского отдельного моторизированного понтонно-мостового Венского орденов Александра Невского и Красной Звезды батальона».

7 мая была праведзена літаратурна-музычная вечарына «Я родом не из детства – из войны…», прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння Юліі Друнінай. Для прысутных на вечарыне чытачоў і бібліятэкараў былі прачытаны вершы, напісаныя паэткай у гады ваеннага ліхалецця і ў пасляваенныя гады, прагучалі песні ваеннай тэматыкі ў выкананні А. Махцеева.

У рамках святкавання Дня Перамогі ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі А.У. Пуртава «Они сражались со смертью: медицина Россонского района 1941–1944».

20 лістапада ў агульнай чытальнай зале бібліятэкі адбылася прэзентацыя яшчэ аднаго выдання, прысвечанага тэме Вялікай Айчыннай вайны – кнігі А.М. Падліпскага і У.А. Рызо «Лагерь смерти “5-й полк”».

У лістападзе супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у арганізацыі і правядзенні ўзнагароджання пераможцаў абласнога літаратурнага конкурсу «Нам жыць і помніць», ініцыіраванага Віцебскім аддзяленнем ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», да якога падрыхтавалі электронную прэзентацыю пра работу бібліятэк Віцебшчыны па святкаванні 70-годдзя вызвалення вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На працягу года ў бібліятэцы праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю літаратуры па мастацтве. Было арганізавана 43 тэматычныя выставы па жывапісе і скульптуры, музыцы і тэатры: «Мастера театральной сцены»; «Всем сердцем и помыслами со своим народом: к 100-летию со дня рождения М.Г. Фрадкина»; «Имя, которое служит Витебску: к 160-летию со дня рождения Ю.М. Пэна»; да Дня беларускага кіно «Документальное наследие»; «Страницы белорусской музыки: к 100-летию со дня рождения И.Г. Нисневича и С.Г. Нисневич» і інш.

Бібліятэка працягвала працу па папулярызацыі творчасці віцебскіх мастакоў. Было арганізавана 7 мастацкіх выстаў, сярод якіх юбілейная выстава «Пленэр» мастака Р.С. Фядзькова, персанальная выстава графікі «З кнігі сноў» члена Саюза дызайнераў Рэспублікі Беларусь А.В. Гурынай, персанальныя выставы жывапісу «Лазні» В.В. Шамшура, «Гарадскі раманс» Г.С. Васільевай, «Рэтраспектыва» В.І. Ральцэвіча.

У рамках мастацкага праекта «Вяртанне ў Віцебск» (куратар праекта мастацтвазнаўца М.Л. Цыбульскі) прайшлі: персанальная выстава «Струны прасторы і часу» мастака Уладзіміра Іванавіча Пракапцова, генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, члена Беларускага саюза мастакоў і прэзентацыя кнігі Б. Крэпака «Владимир Прокопцов. Неудержимая квадрига жизни», а таксама мастацкая выстава Паўла Васільевіча Масленікава «Прастора сцэны» з прэзентацыяй кніг аб ім («Павел Масленікаў», «Павел Масленников. Художник в зеркале времени»). На выставе былі прадстаўлены 10 работ мастака з фондаў Магілеўскага абласнога мастацкага музея. У рамках праекта адбылася цырымонія памятнага гашэння канверта з арыгінальнай маркай, выпушчанага Міністэрствам сувязі і інфармацыі Рэспублікі Беларусь да юбілею мастака. Наведвальнікі мерапрыемства атрымалі магчымасць пазнаёміцца з мастацка-дакументальным фільмам «Сёмае неба Паўла Масленікава» тэлерадыёкампаніі «Магілёў», створаным Ганнай Лапо і рэжысёрам-пастаноўшчыкам Андрэем Пачалавым у 2014 годзе.

У рамках мастацка-эстэтычнага салона «ОЛИ-Art», які працуе пры аддзеле літаратуры па мастацтве, адбыўся творчы вечар Валерыя Данілавіча Анісенкі – заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Пад час вечарыны быў паказаны ўрывак з праграмы вечара ў тэатральнай гасцёўні «Прызнанне. Лісты і песні кахання» ў выкананні В. Анісенкі і студэнткі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў С. Сухадолавай (канцэртмайстр А. Парфёнава). В. Анісенка адказаў на шматлікія пытанні прысутных і расказаў аб праекце «Чэхаў на пленэры», які ўключае ў сябе спектаклі «Чайка» і «Дзядзька Ваня». На вечарыне быў паказаны ўрывак са спектакля «Чайка», гучала музыка ў выкананні навучэнцаў музычнага каледжа імя І.І. Салярцінскага, вершы віцебскіх паэтаў.

Вечар памяці «І ў песні горад над Дзвіной» быў прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння кампазітара М. Фрадкіна. З цікавымі фактамі з біяграфіі вядомага кампазітара, ураджэнца Віцебска М. Фрадкіна і гісторыяй стварэння шматлікіх песен пазнаёміў прысутных вядучы вечара і аўтар кнігі «Маршал савецкай песні» А.М. Падліпскі. На вечары прагучалі як гуказапісы твораў М. Фрадкіна, так і песні ў выкананні лаўрэатаў абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў В. Секунда і Т. Кулаковай, студэнтаў музычнага каледжа імя І.І. Салярцінскага. Сваімі ўспамінамі аб сустрэчах з Маркам Фрадкіным

ДАДАТКІ

Табліца № 1

СЕТКА ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2014 ГОДЗЕ

	2013	2014	ВЫБЫЛІ З СЕТКІ					РЭАРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЭСЫ			КАМБІНАВАНЫЯ СТРУКТУРЫ (усяго)		ПНТ. б-кі	Бібл. обуг	Бібл. пункты (усяго)
			Закрыты		Рэарганізаваны										
			б-кі	б-кі-кл.	абʼед. у кл.-б-кі	абʼед. б-к	пераўтв. у кл.-б-кі	пераўтв. у б-кі-клубы	абʼед. з кл. у б-кі-кл.	б-кі-кл. пераўтв. у б-кі	Б-кі-кл.	Б-кі-музей	Кл-б-кі		
Бешанковіцкая	21	17	4								1		2	1	0
Браслаўская	35	28	5		2								2	1	6
Верхнядзвінская	22	20					2	1			5		7	1	8
Віцебская	36	28	3	3	2			1	1	1	3		5	1	1
Глыбоцкая	34	27	7							3		1		1	28
Гарадоцкая	31	26	2	1		1	1				1	1	4	1	19
Докшыцкая	28	28									3			1	0
Дубровенская	22	22		1				4			5	1		1	2
Лепельская	23	20	1	1	1			3		1	3	3	2	1	18
Лёзненская	21	16	2	1	2							1	3		9
Міёрская	31	25	5	1							3			0	3
Аршанская	45	45									3		1	1	0
Полацкая	42	35	5	2				2			5	1		1	3
Пастаўская	30	28	2					1		1		1	1	0	2
Расонская	14	14							1		2		2	1	0
Сенненская	24	22	2						1		1	1	1	1	3
Талачынская	23	20	2	1				2			2			1	1
Ушацкая	21	19	2								1			0	1
Чашніцкая	24	20	4					1			2			1	13
Шаркаўшчынская	21	21						1			1		1	1	0
Шумілінская	23	22	1											1	1
Усяго па РЦБС	**571**	**503**	**47**	**11**	**7**	**1**	**3**	**16**	**3**	**6**	**41**	**10**	**29**	**9**	**18**	**118**
г. Віцебск	21	21													0	55
г. Наваполацк	7	7													0	0
Усяго па ГЦБС	**28**	**28**													0	**55**
Абл. б-ка	1	1													0	0
УСЯГО	**600**	**532**	**47**	**11**	**7**	**1**	**3**	**16**	**3**	**6**	**41**	**10**	**29**	**9**	**18**	**173**

і не абмяжоўвацца толькі вузкай тэматыкай, таму ўсё цяжэй становіцца вызначыць праблематыку клуба. Клубная работа павышае імідж бібліятэкі ў вачах чытача, развівае чытацкую культуру. Рэалізуючыся ў розных формах масавай работы, яна дазваляе бібліятэцы праявіць асаблівае стаўленне да сваіх чытачоў, спрыяць іх духоўна-маральнаму і эстэтычнаму развіццю, захоўваць нацыянальную культуру.

падзяліліся: Юлія Левіна, дачка акцёра Барыса Левіна – сябра М. Фрадкіна, народная артыстка Беларусі Святлана Акружная, дырэктар культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кальцо Віцебска «Дзвіна» Віктар Кібісаў, журналіст віцебскага тэлебачання Валерый Зельвінскі. На вечары выступіў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы, «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», Кавалер ордэна Францыска Скарыны Міхаіл Мікалаевіч Волкаў.

Прапагандзе здаровага ладу жыцця і прафілактыцы розных распаўсюджаных залежнасцяў быў прысвечаны шэраг мерапрыемстваў.

Міжнародны дзень здароўя (7 красавіка) у бібліятэцы быў адзначаны правядзеннем Дня здароўя «Мы выбіраем здаровы лад жыцця». У праграму мерапрыемства ўвайшлі выстава-прагляд літаратуры медыцынскай тэматыкі «К здоровью с книгой» і бібліяграфічны агляд «Слагаемые здоровья» для членаў клуба пажылых людзей «Сяброўства», які працуе пры савеце ветэранаў Першамайскага раёна, і членаў клуба «Залаты ўзрост», што дзейнічае пры Першамайскай раённай арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа, а таксама для ўсіх жадаючых

5 лютага ў філіяле № 3 ДУАЗ «ВГЦП» паліклінікі № 4 імя У.І. Леніна прайшло пасяджэнне медыцынскіх работнікаў, прысвечанае пытанням здаровага ладу жыцця насельніцтва. У рамках мерапрыемства супрацоўнікамі бібліятэкі была прадстаўлена выстава-прагляд «Мой здоровый образ жизни» і бібліяграфічны агляд літаратуры па тэме.

1 снежня ў рамках чарговага пасяджэння народнага клуба кветкаводаў-аматараў «Флора» ў бібліятэцы адбылася сустрэча з прафесарам, доктарам фармацэўтычных навук, загадчыкам кафедры фармакагнозіі і батанікі УА «ВДМУ» Георгіем Мікалаевічам Бузуком «Травы – драгоценное покрывало Земли», прысвечаная пытанням фітатэрапіі.

Працягвалася работа з людзьмі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і сацыяльна неабароненымі слаямі насельніцтва ў рамках рэалізацыі праграмы «Свет души рассеет тьму».

Супрацоўнікі бібліятэкі наведалі аддзяленне рэабілітацыі інвалідаў па зроку Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання ветэранаў і інвалідаў, дзе азнаёміліся з працэсам і спецыфікай працы па рэабілітацыі і сацыяльнай адаптацыі інвалідаў па зроку, атрымалі рэкамендацыі спецыялістаў цэнтра па зносінах і карэктных паводзінах у дачыненні да людзей з інваліднасцю.

Выкарыстоўваючы тыфлаабсталяванне, якое складаецца з камп’ютара з усталяванай на ім праграмай «JAWS for Windows Screen Reading Software», апаратна-праграмнага комплексу «Читающая машина ElecGeste INFA-300», аддзел сканіраваў друкаваныя тэксты і запісваў на электронныя носьбіты файлы ў аўдыяфармаце, захоўваў тэксты ў гукавыя файлы ў фармаце MP3 на здымных носьбітах.

На працягу года ў бібліятэцы праводзіліся пасяджэнні творчага аб’яднання людзей з аслабленым зрокам і невідушчых паэтаў-аматараў

літаратурнага аб’яднання «Натхненне» Віцебскай гарадской арганізацыі «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку». 23 красавіка адбылася творчая сустрэча з віцебскай паэтэсай, членам ГА «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» Галінай Уладзіміраўнай Пруднікавай. 12 лістапада прайшла літаратурна-музычная вечарына «Поэзии и музыки связующая нить». З 2 па 18 снежня ў аддзеле перыядычнай літаратуры была арганізавана выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Струны души».

Абслугоўванне чытачоў старэйшага ўзросту і інвалідаў бібліятэкары працягвалі ажыццяўляць у рамках распрацаванай праграмы «Міласэрнасць і кніга», якая разлічана на сацыяльную адаптацыю слаба абароненых слаёў насельніцтва, у тым ліку дзяцей.

Праграмай прадугледжаны наладжванне і працяг супрацоўніцтва з шэрагам гарадскіх устаноў і арганізацый: Віцебскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцай, УА «Віцебская дапаможная школа № 26», інтэграванай групай ДУА «Яслі-сад № 6», Варонаўскім домам-інтэрнатам для састарэлых і інвалідаў, Вялікалятчанскім дзіцячым домам і інш.

Бібліятэкай было ініцыіравана праведзенне дабрачынных акцый па зборы кніг для дзяцей, якія знаходзяцца на лячэнні ў бальніцах або выхоўваюцца ў дзіцячых дамах, падрыхтаваны шэраг сацыякультурных мерапрыемстваў. Сярод іх – навагодняе прадстаўленне «Рождественский подарок», якое прайшло ў дзіцячым афтальмалагічным аддзяленні Віцебскай абласной клінічнай бальніцы, свята Масленіцы, якое адбылося для выхаванцаў Віцебскага дзіцячага дома.

З мэтай прыцягнення пенсіянераў да актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства, далучэння пажылых людзей да сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у бібліятэцы працавала «Школа камп’ютарных ведаў». На працягу года супрацоўнікі электроннай чытальнай залы праводзілі бясплатныя трэнінгі і практычныя заняткі па вызначаных напрамках. Усяго за справаздачны перыяд у праекце прынялі ўдзел 73 чалавекі.

У мінулым годзе публічны цэнтр прававой інфармацыі забяспечваў свабодны доступ усіх катэгорый грамадзян да прававой інфармацыі, гарантаваў паўнату і аператыўнасць прадастаўлення актуальнай прававой інфармацыі і карыстаўся дастаткова высокім попытам у наведвальнікаў.

У аддзеле ПЦПІ было зарэгістравана 3511 карыстальнікаў розных катэгорый. Работнікамі аддзела задавальняліся самыя разнастайныя запыты па прававой тэматыцы. У фонд ПЦПІ паступіла 173 кніжныя выданні, аддзел атрымліваў 33 найменні юрыдычных перыядычных выданняў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Пачалася работа над стварэннем інфармацыйных дасье па актуальных тэмах (публікацыі з перыядычных выданняў, каментарыі да нарматыўных дакументаў і інш.): «У інтарэсах спажыўца», «Прыватызацыя жылля», «Пенсійнае забеспячэнне». Таксама была распачата работа па стварэнні электроннага рэсурсу «Формы юрыдычных дакументаў» (з указаннем крыніц апублікавання), у які ўвайшлі іскавыя заявы, прэтэнзіі, дагаворы, даверанасці і інш.

экалагічнай культуры (*«Экоша»* Дзісненскай дзіцячай бібліятэкі Міёрскага раёна, *«Весёлый муравейник»* Фарынаўскай сельскай бібліятэкі Полацкага раёна, *«Крынічка»* Коханаўскай гарпасялковай бібліятэкі Талачынскага раёна), краязнаўчай накіраванасці (*«Вытокі»* Лынтупскай сельскай бібліятэкі Пастаўскага раёна, *«Крыніца»* Ушацкай дзіцячай бібліятэкі), *«Нашчадкі»* Зоркаўскай сельскай бібліятэкі Шаркаўшчынскага раёна), духоўнай культуры (*«Благовест»* Марцыбылінскай сельскай бібліятэкі Глыбоцкага раёна, *«Весёлый апельсин»* Крапівенскай сельскай бібліятэкі Аршанскага раёна). Для дзяцей праводзяцца экавандроўкі, гутаркі, віктарыны, літаратурна-пазнавальныя гульні, бібліятэчныя ўрокі, віртуальныя падарожжы, урокі ветлівасці і дабрыні, ладзяцца ранішнікі, гульнёвыя праграмы, конкурсы творчых работ, прэзентуюцца кнігі, часопісы і інш.

Вызначэнне свайго месца ў сувязі са зменай сацыяльнага статусу, адаптацыя да новай ролі ў грамадстве, дэфіцыт зносін – усе гэтыя праблемы выклікаюць неабходнасць маральнай і псіхалагічнай падтрымкі пажылых людзей, і нярэдка яны спадзяюцца атрымаць яе менавіта ў бібліятэцы. У бібліятэках вобласці дзейнічаюць больш за 40 клубаў для пажылых людзей (*«Сустрэча»* Друеўскай сельскай бібліятэкі Браслаўскага раёна, *«Сердечные встречи»* сельскай бібліятэкі-клуба аграгарадка Сіпішчава Дубровенскага раёна, *«Залаты узрост»* Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі, *«Для тых, каму за…»* Старскай сельскай бібліятэкі Аршанскага раёна і інш.).

Па-ранейшаму не губляюць сваёй папулярнасці клубы аматараў кветкаводства, садаводства і агародніцтва (*«Флора»* Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, *«Собеседница»* цэнтральнай раённай бібліятэкі Дубровенскага раёна), а таксама клубы для жанчын (*«Святліца»* Дзісненскай гарпасялковай бібліятэкі, *«Гаспадыня»* Сакалішчанскай сельскай бібліятэкі Расонскага раёна, *«Алеся»* Гаранскай сельскай бібліятэкі Полацкага раёна, *«Матырынскія гаспадыні»* Матырынскай сельскай бібліятэкі Лепельскага раёна) і сямейныя клубы (*«Дочкі-матулі»* Барсукоўскай сельскай бібліятэкі Докшыцкага раёна, *«Очаг»* сельскай бібліятэкі аграгарадка Надзёжына, *«Гармонія»* Замастоцкай сельскай бібліятэкі Віцебскага раёна).

Для чытачоў захопленых мастацтвам, якія імкнуцца да самаадукацыі, да зносін у сферы духоўных інтарэсаў адкрыты літаратурныя і музычна-літаратурныя гасцёўні (*«Сустрэча»* Краснапольскай сельскай бібліятэкі Расонскага раёна, *«Литературная гостиная»* Асвейскай гарпасялковай бібліятэкі Верхнядзвінскага раёна, *«Лира»* Ноўкінскай сельскай бібліятэкі Віцебскага раёна, *«Вдохновение»* бібліятэкі імя У. Корбана г. Оршы і інш.). Праводзяцца прэзентацыі творчасці мясцовых аўтараў, вечары-партрэты, разгорнутыя экспазіцыі да юбілейных дат, сустрэчы з цікавымі людзьмі.

Клубы па інтарэсах – гэта форма дыферэнцыраванай работы з рознымі сацыяльнымі групамі і катэгорыямі насельніцтва. Варта адзначыць, што бібліятэкары імкнуцца пашырыць кола інтарэсаў чытачоў

падрыхтаваны і праведзены экспрэс-інфармацыя «Материальная помощь неполным семьям» (в. Шульцава, в. Васюты), «В помощь налогоплательщику» (в. Хайсы), інфармацыйныя гадзіны «Каждое третье коррупционное преступление – взятка» (в. Бялынавічы, в. Жабенцяі).

Адной з эфектыўных форм работы ПЦПІ застаюцца мэтавыя бібліятэчныя праграмы прававой скіраванасці.

У 2014 годзе была працягнута рэалізацыя мэтавых комплексных праграм «Гражданин XXI века – молодежная школа права» (на базе ПЦПІ Аршанскай цэнтральнай бібліятэкі імя А. Пушкіна), «Основы правовых знаний», «Правовой эрудит», «Молодежь и закон» (на базе Полацкай гарадской бібліятэкі імя Ф. Скарыны), у рамках якіх прайшлі больш за 50 розных па змесце і форме мерапрыемстваў.

Абагуліўшы вопыт работы публічных бібліятэк па фарміраванні прававой культуры можна сцвярджаць, што створаная ў вобласці сістэма ПЦПІ паспяхова функцыянуе. Змест дзейнасці бібліятэк скіраваны на рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы прававой асветы. Наладжана цеснае ўзаемадзеянне паміж рознымі ўстановамі і насельніцтвам. Захоўваецца тэндэнцыя развіцця сеткі ПЦПІ, а таксама мадэрнізацыі і стварэння новых рабочых месцаў для самастойнай работы карыстальнікаў.

КЛУБЫ ПА ІНТАРЭСАХ І АМАТАРСКІЯ АБ'ЯДНАННІ

Васілеўская А.М.,
галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства
ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

Сярод формаў і накірункаў культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэк Віцебскай вобласці традыцыйна запатрабаванай сярод насельніцтва з'яўляецца работа клубаў па інтарэсах пры бібліятэках. У бібліятэках вобласці працуе 489 клубаў па інтарэсах (аматарскіх аб'яднанняў). Так, найбольшая іх колькасць прыходзіцца на Аршанскі (44), Віцебскі (32), Гарадоцкі (28), Докшыцкі (28), Шумілінскі (25) раёны і г. Віцебск (26). 13 клубаў маюць званне «народны».

Усе клубы па інтарэсах (аматарскія аб'яднанні) можна класіфікаваць па тэматычным накірунку і мэтавай аўдыторыі. Напрыклад, па ўзросце. Пастаяннымі чытачамі бібліятэк застаюцца дзеці і падлеткі. Таму ў ЦБС вобласці найбольшая колькасць клубаў адносіцца да гэтай катэгорыі – іх 267. Для карыстальнікаў працуюць клубы аматараў кнігі і чытання (*«Беларусінка»* сельскай бібліятэкі аграгарадка Пушкі Лёзненскага раёна, *«Юный книголюб»* сельскай бібліятэкі аграгарадка Ляды Дубровенскага раёна), клубы па агранізацыі вольнага часу (*«Самоделкин»* Каўлякоўскай сельскай бібліятэкі Шумілінскага раёна, *«Ачумелыя ручкі»* бібліятэкі імя А. Астроўскага г. Віцебска, *«Вясёлка»* Рубежскай сельскай бібліятэкі Браслаўскага раёна) і па выхаванні

Для пошуку нацыянальных заканадаўчых дакументаў, а таксама заканадаўчых актаў Расійскай Федэрацыі шырока выкарыстоўвалася электронная інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС) «Эталон». У зале праводзіліся кансультацыі наведвальнікаў, ажыццяўлялася даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў. За 2014 год было атрымана 4270 тэматычных запытаў, падрыхтавана 4670 даведак прававой тэматыкі, а колькасць карыстальнікаў ЭБД «Эталон» склала 3320 чалавек.

Для больш зручнага, хуткага і мабільнага задавальнення разавых запытаў аддаленых карыстальнікаў працавала Віртуальная даведачная служба, размешчаная на галоўнай старонцы афіцыйнага сайта бібліятэкі. Супрацоўнікамі бібліятэкі выконваліся запыты для карыстальнікаў па розных тэмах: «Імёны карэнных жыхароў Амерыкі: семантычны аспект», «Гістарычная думка эпохі Адраджэння», «Індывідуальнае абслугоўванне чытачоў у публічных бібліятэках» і інш.

З мэтай прыцягнення ў бібліятэку новых чытачоў, папулярызацыі кнігі, чытання ў асяроддзі дзяцей і падлеткаў, а таксама раскрыцця кніжнага фонду аддзела дзіцячай літаратуры, на працягу года вялася работа па арганізацыі кніжных выстаў і культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў. Работа вялася па розных напрамках: патрыятычным выхаванні, папулярызацыі беларускай літаратуры і краязнаўства, экалагічнай асвеце, прапагандзе здаровага ладу жыцця.

З 24 па 28 сакавіка ў аддзеле дзіцячай літаратуры прайшоў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі пад агульнай назвай «Сладкая карусель». Цікавая, насычаная праграма была прапанавана юным чытачам: выстава дзіцячай творчасці «Краски рисуют сказки», літаратурнае падарожжа «Хорошо бродить по свету с карамелькой за щекою», гульнявое мерапрыемства «Шутки, песни, сладости нам прибавят радости», акцыя «На вкус и цвет товарищей нет», а таксама пазнавальныя гадзіны, конкурсы, гутаркі і віктарыны.

Для прыцягнення дзяцей да чытання кніг на роднай мове быў праведзены Дзень роднай мовы, пад час якога была падрыхтавана выстава «Беларуская мова – родная мова», для вучняў з УА «Віцебская дапаможная школа № 26» былі праведзены громкія чытанні «Жывая кніга», а для вучняў, якія знаходзяцца ў групах прадоўжанага дня ДУА «Сярэдняя школа № 12» была праведзена інтэлектуальная гульня «Загадаю я па-руску, адкажу па-беларуску».

У год 70-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў святкаванне Дня Перамогі адбывалася ў аддзеле дзіцячай літаратуры на працягу тыдня. За гэты час юныя чытачы пазнаёміліся з творчасцю беларускага пісьменніка В. Быкава, пабывалі на ўроках мужнасці, прынялі ўдзел у выставе дзіцячай творчасці «Дети рисуют войну», у акцыях «На войне любили стихи» і «Несколько слов о войне». Запамінальным мерапрыемствам для хлопчыкаў і дзяўчынак з 4 «Д» класа ДУА «Сярэдняя школа № 40» стала паездка на плошчу Перамогі. Пад час мерапрыемства дзеці даведаліся аб тым, якімі былі гады Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне, усклалі кветкі да Вечнага агню

і выпусцілі ў неба чырвоныя шары, на якіх напісалі словы падзякі і пажаданні ветэранам.

На афіцыйным сайце бібліятэкі была выстаўлена дзіцячая старонка. На ёй юныя чытачы могуць знайсці інфармацыю пра творчасць пісьменнікаў-юбіляраў, пазнаёміцца з новымі паступленнямі і самымі папулярнымі кнігамі аддзела дзіцячай літаратуры, даведацца пра кнігі-юбіляры гэтага года, а кіраўнікі дзіцячага чытання змогуць знайсці сцэнарыі для правядзення мерапрыемстваў і метадычныя матэрыялы.

У рамках міні-праекта «Гульнятэка ў бібліятэцы» супрацоўнікі Нямецкай чытальнай залы ў апошні чацвер кожнага месяца па папярэдняй дамоўленасці прыходзілі ў школы горада, дзе праводзілі заняткі са сваімі будучымі чытачамі ў форме моўных, навучалых і развіваючых гульняў на нямецкай мове.

Пад час летніх канікул сектарам замежнай літаратуры быў рэалізаваны праект Open air-чытанняў – чытанняў на адкрытым паветры для ўдзельнікаў лінгвістычнага лагера СШ № 29 г. Віцебска для замацавання навыкаў успрымання англійскай мовы на слых.

На працягу многіх год бібліятэка плённа супрацоўнічае з Інстытутам імя Гётэ ў Мінску. Па яго ініцыятыве і пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Федэратыўнай Рэспублікі Германія дырэктар бібліятэкі Т.М. Адамян з прафесійным візітам наведала бібліятэкі г. Берліна і г. Лейпцыга, дзе на працягу тыдня знаёмілася з інавацыйнымі канцэпцыямі развіцця сучасных бібліятэк.

У студзені 2014 года ў рамках рэалізацыі праекта «LeWiS» дырэктарам ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» і дырэктарам СШ № 45 г. Віцебска быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве. Мэтай дагавора з’яўляецца аказанне метадычнай дапамогі ў вывучэнні нямецкай мовы і арганізацыі мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца як на базе абласной бібліятэкі, так і школы.

У верасні мінулага года ў мэтах умацавання двухбаковых адносін, якія спрыяюць стварэнню інтэграваных нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў і іх рацыянальнаму выкарыстанню, паміж Віцебскай абласной бібліятэкай і Дзяржаўнай публічнай гістарычнай бібліятэкай Расіі (г. Масква) падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве.

Супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у міжнародным праекце «Расул Гамзатов. Мой Дагестан», ініцыіраваным Хасаўюртаўскай цэнтральнай гарадской бібліятэкай. Праект ажыццяўляўся шляхам падрыхтоўкі відэаролікаў з запісамі чытання ўрыўкаў пераклада лірычнай аповесці Р. Гамзатава «Мой Дагестан» на рускую мову. Віцебскай абласной бібліятэкай былі падрыхтаваны 3 відэафайлы, якія ў далейшым былі размешчаны на інтэрнэт-сервісе www.youtube.com.

Асноўнымі напрамкамі работы аддзела бібліятэказнаўства былі: метадычны маніторынг стану бібліятэк сеткі Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці; вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне інавацый і перадавога бібліятэчнага вопыту; аналіз сучаснага стану сістэмы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў вобласці і яе

(Лёзненская ЦРБ), дзелавая гульня «На вершине успеха» (ЦБ імя Францыска Скарыны Полацкай раённай сеткі публічных бібліятэк).

Для юных карыстальнікаў былі падрыхтаваны відэапрэзентацыя «Занимательное правоведение в Интернете» (дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака Наваполацкай гарадской сеткі публічных бібліятэк), турніры знатакоў права, гульнявыя праграмы ў ДУ «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска» – «Моё право. Мой выбор. Моя ответственность» (бібліятэка імя І. Крылова), «Много ли прав у ребёнка» (бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай), «Каждой сказке – правовая подсказка» (бібліятэка імя А. Гайдара), прававы лекторый «Лабиринты права», конкурс малюнка «Я – гражданин Республики Беларусь» (бібліятэка імя М. Лынькова).

Для карыстальнікаў ПЦПІ былі аформлены бібліятэчныя выставы: «День памяти. День гордости. День Независимости», «Право на страницах журналов», «Предпринимательская деятельность: правовые аспекты», «Детское благополучие – забота общая: правовые аспекты усыновления», «Льготы и гарантии молодым семьям», «Абитуриенту на заметку», «Труд молодых специалистов: ответы на актуальные вопросы» і інш.

Павышэнню юрыдычнай граматнасці насельнітцва садзейнічалі сустрэчы з супрацоўнікамі юрыдычных служб, праваахоўных органаў, прадстаўнікамі мясцовай улады і іншымі арганізацыямі.

Мерапрыемствы арганізуюцца многімі цэнтральнымі і гарадскімі бібліятэкамі вобласці. Сустрэчы адбываюцца ў Браслаўскай, Віцебскай, Аршанскай, Полацкай, Сенненскай і іншых сістэмах. На працягу 2014 года ў бібліятэах вобласці праведзена **144** юрыдычныя кансультацыі. Можна адзначыць работу ПЦПІ ДУ «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска», дзе кансультацыі вузкіх спецыялістаў па тэмах «Правовое обеспечение пожилых людей», «Новое в жилищном законодательстве», «Знать законы – быть защищенным», «Права потребителей» атрымалі ўсе зацікаўленыя катэгорыі грамадзян.

Юрыдычная дапамога аказваецца штомесячна ў рамках праекта «Информация о налогах для всех» у ПЦПІ цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя У. Маякоўскага, што дзейнічае на базе гарвыканкама, спецыялістамі інспекцыі МНС па г. Наваполацку. У справаздачным годзе ў рамках агульнарэспубліканскай акцыі «Открытые двери» быў праведзены таксама і тыдзень медыяцыі.

У практыку работы ПЦПІ публічных бібліятэк уваходзяць і дыстанцыйныя кансультацыі. Прыкладам можа служыць дзейнасць Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, дзе, пачынаючы з 2010 года, юрыдычныя кансультацыі праводзяцца сумесна з Цэнтрам прававой інфармацыі і студэнцкай службай прававой інфармацыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У Віцебскай раённай сетцы публічных бібліятэк практыкуюцца выезды бібліобусаў, дзе супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі праводзяць для насельніцтва аддаленых населеных пунктаў інфармацыйныя гадзны і выставы-прагляды. Так, у 2014 годзе былі

Усе прававыя цэнтры аснашчаны камп'ютарнай тэхнікай (121 камп'ютар, 97 прынтараў), забяспечаны эталоннай базай даных прававой інфармацыі, большасць з іх падключаны да сеткі інтэрнэта (88 – 91%), маюць адрасы электроннай пошты.

Аб запатрабаванасці паслуг ПЦПІ сведчаць статыстычныя дадзеныя. Адпаведна статыстыкі, у мінулым годзе было зафіксавана **13 171** карыстальнік, наведванні склалі **39 445**, па запытах карыстальнікаў выдавалася **102 224** экзэмпляраў дакументаў, аказана больш за **21 тыс.** даведачных і кансультацыйных паслуг. Колькасць зваротаў да прававых баз даных дасягнула больш за **16 тыс**.

Дзейнасць ПЦПІ Віцебскай абласной бібліятэкі па прававой асвеце носіць сістэмны характар і скіравана на забеспячэнне задавальнення патрэбнасцяў розных катэгорый насельніцтва, а таксама прадастаўленне аператыўнага доступу да актуальнай прававой інфармацыі ў рэжыме аддаленага доступу.

За мінулы год бібліятэкай былі падрыхтаваны віртуальныя экскурсіі «Азбука прав человека», «Выдающиеся юристы прошлого», online-выставы «Выборы: права и обязанности», «Интеллектуальная собственность. Проблемы защиты», «Туризм в СНГ: нормативное регулирование», «В помощь юрисконсульту», электронныя версіі бібліяграфічных выданняў «Малый и средний бизнес в Республике Беларусь», «Правовое регулирование наследования, завещания, дарения», «Спорт и право в Республике Беларусь».

Пытанні прававой тэматыкі разглядаліся спецыялістамі бібліятэк на пасяджэннях круглых столоў, семінарах. У 2014 годзе ў Віцебскай абласной бібліятэцы адбыўся круглы стол «Развіццё сеткі ПЦПІ ў Віцебскай вобласці на сучасным этапе» з удзелам намесніка дырэктара Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі А. Бабцова, начальніка аддзела культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па спарвах моладзі П. Падгурскага, дырэктара Рэгіянальнага цэнтра ПЦПІ Л. Дорагавай, кіраўнікоў і спецыялістаў публічных бібліятэк г. Віцебска і Віцебскага раёна. На базе Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага прайшоў семінар «Сумесная работа бібліятэк з органамі аховы парадку і грамадскімі арганізацыямі ў прапагандзе прававых асноў супрацьдзеяння гандлю людзьмі» з удзелам Першамайскага аддзялення абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа.

Фарміраванню прававой культуры грамадзян садзейнічаюць розныя формы і метады работы. У 2014 годзе супрацоўнікамі ПЦПІ Віцебскай вобласці было праведзена больш за **400** мерапрыемстваў, скіраваных на інфармаванне насельнітцва ў сферы заканадаўства і права. Гэта традыцыйныя для практыкі формы работы: бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі, гульні, віктарыны, конкурсы, тэматычныя кніжныя выставы, прэзентацыі. Так, у бібліятэках вобласці прайшлі дзень прававой інфармацыі «Права семьи – забота государства» (Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага Лепельскай раённай сеткі публічных бібліятэк), пазнавальная гутарка «Твои права – узнай о них все»

ўдасканаленне; развіццё сувязяў з грамадскасцю, актывізацыя рэкламнай дзейнасці абласной бібліятэкі і інш.

Для вышэйстаячых арганізацый і ўстаноў на працягу справаздачнага года было падрыхтавана 75 аналітычных даведак, матэрыялаў і звестак.

У красавіку 2014 года прайшоў семінар «Публічная бібліятэка: новыя магчымасці і прыярытэты развіцця» для дырэктараў гарадскіх і раённых сетак публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, у ходзе якога былі падведзены вынікі работы бібліятэк сеткі Міністэрства культуры за 2013 год, агучаны прыярытэты і актуальныя праблемы бібліятэчнай практыкі, яе сувязь з бібліятэчнай адукацыяй. У рамках семінара адбыўся круглы стол «Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк: праблемы стварэння і даступнасці».

Для загадчыкаў аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк Віцебскай вобласці ў маі быў арганізаваны двухдзённы семінар «Маркетынгавая арыентацыя бібліятэчнай дзейнасці». Даклады выступоўцаў былі прысвечаны пытанням інтэграваных маркетынгавых камунікацый, сацыяльнай рэкламе і адаптацыі персаналу бібліятэкі да інавацый. У рамках семінара адбыўся круглы стол «Складаючыя поспеху: PR-тэхналогіі публічных бібліятэк» і сустрэча з прадстаўнікамі выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Он-лайн канферэнцыя па тэмах «Прыярытэтныя накірункі работы публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2015 годзе», «Бібліятэчная статыстыка як фактар кіравання сучаснай бібліятэкай» ладзілася для дырэктараў і намеснікаў дырэктараў публічных бібліятэк Віцебскай вобласці.

29 кастрычніка ў Віцебскай абласной бібліятэцы адбыліся абласныя навуковыя чытанні маладых бібліятэкараў «Пошукавая і даследчая дзейнасць бібліятэк», у якіх прынялі ўдзел спецыялісты і кіраўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі, публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў г. Віцебска. У ходзе выступленняў і дыскусіі ўдзельнікі абмеркавалі актуальныя пытанні тэарэтычных і практычных аспектаў пошукава-даследчай дзейнасці бібліятэк. Да дня правядзення навуковых чытанняў быў падрыхтаваны і выдадзены зборнік дакладаў маладых бібліятэкараў, арганізавана выстава метадычных распрацовак і даследчых работ удзельнікаў.

Усяго аддзеламі бібліятэкі было падрыхтавана і выдадзена 19 найменняў друкаваных выданняў, сярод якіх «Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён», «Каляндар знамянальных і памятных дат на 2015 год», матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Книжное наследие А.П. Сапунова», каталог «Вячаслаў Шамшур. Класіка сучаснага пейзажа» і інш.

Бібліятэка прымала ўдзел у інтэрактыўных формах камунікацыі, так, у чэрвені спецыялісты і кіраўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі прынялі ўдзел у рэспубліканскай інтэрнэт-нарадзе па пытаннях аб'яднання публічных і школьных бібліятэк у сельскай мясцовасці,

ініцыіраванай Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

22–23 кастрычніка дэлегацыя ад бібліятэкі прыняла ўдзел у рабоце II Міжнароднага кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры», арганізаванага Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, у рамках якога быў прадстаўлены даклад «База даных “Дарогамі вызвалення Віцебшчыны”: вопыт стварэння і выкарыстання».

19 снежня на круглым стале «Камплектаванне фондаў бібліятэк Беларусі ў кантэксце сучасных патрабаванняў грамадства», арганізаваным Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, прагучала паведамленне «Камплектаванне Віцебскай абласной бібліятэкі: вынікі і перспектывы».

На працягу года карыстальнікам бібліятэкі аказваліся дадатковыя паслугі на платнай аснове. Платныя паслугі былі зарыентаваны на камфортнасць карыстання інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі і задавальненне дадатковых запытаў карыстальнікаў. У справаздачным годзе бібліятэка выканала платных паслуг на суму 120 680 900 рублёў.

Найбольш запатрабаванымі сярод чытачоў з’яўляліся такія віды платных паслуг, як набор і раздрукоўка тэкстаў прынтарамі (15 % ад зароблена сумы), лічбавая фотаздымка (14,5 %), выкарыстанне камерцыйнага і сацыяльна-камерцыйнага фонду (14,4 %). Самым прыбытковым відам платных паслуг заставалася ксеракапіраванне дакументаў (35,8 млн. рублёў, што складае 29,6 % ад агульнай зароблена сумы).

Зароблены сродкі выкарыстоўваліся на закупку кніг для папаўнення камерцыйнага фонду, набыццё тэхнічных сродкаў, рамонт абсталявання і г.д.

ПУБЛІЧНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАСТОРЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Пугачова Н.А.,
загадчык аддзела бібліятэказнаўства
Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна

Бібліятэчная сетка. Асноўныя змены і вектары руху

Мінулы год для публічных бібліятэк быў адметны колькасцю праблем і падманлівых перспектыў, аднак нягледзячы на цяжкасці, можна сцвярджаць, што бібліятэчная справа Віцебскай вобласці – самая вялікая сфера культуры нашага рэгіёна, якая дынамічна развіваецца.

Сучасная бібліятэка ўпэўнена працуе як камбінаваная структура, якая займаецца прасоўваннем чытання, выконвае адукацыйную, сацыякультурную, рэкрэацыйную і іншыя функцыі, дапамагае людзям з абмежаванымі магчымасцямі далучацца да сацыялізацыі ў грамадстве, асвойваць інфармацыйную прастору.

інфармацыйнага і культурнага асяроддзя рэгіёна і ствараюць неабходныя ўмовы для эфектыўнага і якаснага забеспячэння прававой інфармацыяй усіх катэгорый насельніцтва.

Пачынаючы з 2001 года, у вобласці паспяхова рэалізуецца праграма стварэння ПЦПІ на базе агульнадаступных бібліятэк. У 2009 годзе з мэтай развіцця сеткі ПЦПІ была распрацавана і зацверджана «Праграма развіцця публічных цэнтраў прававой інфармацыі і прававой асветы насельніцтва Віцебскай вобласці на 2010–2015 гады». Пашырэнню сеткі ПЦПІ садзейнічае таксама зацвярджэнне Плана мерапрыемстваў па прававой асвеце грамадзян на 2011–2015 гг., адным з пунктаў якога прадугледжваецца «стварэнне механізма інфармацыйна-прававога забеспячэння афіцыйнымі і эталоннымі крыніцамі прававой інфармацыі публічных бібліятэк». Такім чынам, у адпаведнасці з дадзеным Планам і Праграмай развіцця за адзначаны перыяд у вобласці было адкрыта 35 новых ПЦПІ (усяго на пачатак 2010 года было створана 54 ПЦПІ).

Сетка публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў Віцебскай вобласці

Колькасць ПЦПІ	**2011**	**2012**	**2013**	**2014**
пры абласной бібліятэцы	1	1	1	1
на базе цэнтральных бібліятэк	24	24	23	23
на базе гарадскіх бібліятэк	9	10	11	12
на базе гарпасялковых бібліятэк	11	11	11	11
на базе сельскіх бібліятэк	27	32	39	43
на базе дзіцячых бібліятэк	4	4	4	6
УСЯГО	**76**	**82**	**89**	**96**
ПЦПІ ў аграгарадках	***32***	***37***	***46***	***50***
на базе гарпасялковых бібліятэк	*8*	*8*	*8*	*8*
на базе сельскіх бібліятэк	*24*	*29*	*38*	*42*

На працягу 2014 года ў Віцебскай вобласці ажыццяўлялі работу **96 ПЦПІ** (18 % ад агульнай колькасці бібліятэк Віцебскай вобласці), створаныя пры бібліятэках рознага ўзроўню.

Як самастойныя адзінкі ПЦПІ існуюць пры Віцебскай абласной бібліятэцы і Полацкай раённай бібліятэках, астатнія з’яўляюцца часткай структурных падраздзяленняў бібліятэк (чытальныя залы, аддзелы абслугоўвання).

Найбольшая колькасць ПЦПІ сканцэнтравана ў Лепельскім (10), Браслаўскім (8), а таксама Верхнядзвінскім, Гарадоцкім і Полацкім раёнах (па 6).

У 2014 годзе пры публічных бібліятэках адкрыты **7** новых ПЦПІ ў пяці раёнах вобласці: у Браслаўскім раёне пры Іказненскай, Мяжанскай і Пагашчанскай сельскіх бібліятэках, у Бешанковіцкім раёне – пры

«Прафесіянал», у Браславе – творча-інавацыйны праект *«Пашыраем прафесійныя гарызонты».* У рамках гэтых праектаў праводзяцца кансультацыі, практыкумы, адбываецца вучоба кадраў, пашыраюцца агульныя гарызонты прафесійнай і грамадскай дзейнасці бібліятэкараў.

Павышэнню прывабнасці іміджу бібліятэкі спрыяюць і разнастайныя акцыі, рэкламныя праекты, удзел у гарадскіх, раённых мерапрыемствах, днях адчыненых дзвярэй. Так, у Верхнядзвінску прайшлі вулічныя акцыі *«Часопіс выйшаў пагуляць»* і *«Чытаць гэта модна».* Культурна-забаўляльная акцыя *«Бібліяноч-2014»,* якая правадзілася ўжо другі раз у цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага г. Віцебска, зноў сабрала прыхільнікаў кнігі і чытання на цікавыя мерапрыемствы і сустрэчы. У практыку работы бібліятэк Глыбоцкага раёна ўвайшлі такія формы работы, як дзень аднаго аўтара, імпрэза-вернісаж, кастынг кніг і інш. Набывае папулярнасць і стварэнне буктрэйлераў.

Інфармацыя аб значных падзеях з жыцця бібліятэк, іх рэклама па-ранейшаму адлюстроўваецца ў мясцовых сродках масавай інфармацыі, на старонках прафесійных выданняў (для часопіса «Бібліятэчны свет» былі падрыхтаваны матэрыялы Лепельскай ЦБС і Віцебскай ГЦБС), рэгулярна аднаўляецца інфармацыя на сайтах. Працягнуў сваё існаванне сумесны праект тэлерадыёкампаніі «Скіф» з Аршанскай сеткай бібліятэк *«Бібліятэкар раіць пачытаць».*

З мэтай папулярызацыі бібліятэкі, кнігі і чытання ў многіх раёнах праводзіліся сацыялагічныя даследванні, бліц-апытанні і анкетаванні чытачоў, аналізы чытання: супрацоўнікі Пастаўскай раённай бібліятэкі на працягу трох вясенніх месяцаў праводзілі сацыялагічнае даследванне *«Вялікая Айчынная вайна вачамі маладога пакалення*, аддзел бібліятэчнага маркетынгу Лёзненскай раённай бібліятэкі – апытанне *«Кніга і чытанне ў вашым жыцці».*

Бібліятэкары сістэм падтрымліваюць карпаратыўныя сувязі з калегамі з іншых ЦБС вобласці, рэспублікі і блізкага замежжа. За апошнія гады наладзілася супрацоўніцтва Браслаўскай ЦБС і Пушкінагорскай бібліятэкай Пскоўскай вобласці, Лёзненскай ЦБС і Руднянскай ЦБС Смаленскай вобласці (Расійская Федэрацыя), Глыбоцкай ЦБС і Лудзенскай галоўнай гарадской бібліятэкай (Латвія).

АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ПЦПІ ПА ФАРМІРАВАННІ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ РЭГІЁНА

Пугачова Н.А.,
загадчык аддзела бібліятэказнаўства
Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна

Публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), што функцыянуюць пры публічных бібліятэках, з'яўляюцца важнейшым элементам

Развіццё бібліятэчнай галіны Віцебшчыны ажыццяўлялася ва ўмовах дзяржаўнай падтрымкі прыярытэтных накірункаў – удасканалення камплектавання фондаў, аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў, фарміравання электронных рэсурсаў.

*На 01.01.2015 г. колькасць агульнадаступных (публічных) бібліятэк, якія абслугоўвалі насельніцтва Віцебскай вобласці, склала **532** адзінкі. Сярод іх – абласная бібліятэка, 23 цэнтральныя (21 раённая і 2 гарадскія), 37 гарадскіх, 20 гарпасялковых, 36 дзіцячых, 415 сельскіх бібліятэк.*

*З агульнай колькасці бібліятэчных устаноў у вобласці дзейнічала **41** бібліятэка-клуб і **10** бібліятэк-музеяў.*

Статус юрыдычнай асобы набыла Наваполацкая ЦБС (рашэнне гарвыканкама № 306 ад 28.03.2014 г.), якая стала насіць назву ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка».

У апошнія гады захавалася ўстойлівая тэндэнцыя да скарачэння сеткі. На працягу 2014 года ў вобласці фактычна было закрыта 69 устаноў бібліятэчнага тыпу, сярод іх – 3 дзіцячыя. Агульная колькасць сеткавых адзінак скарацілася на **68**. Як факт прыходзіцца канстатаваць, што за апошнія пяць год гэтая лічба значна пераўзышла ўсе папярэднія.

Рэарганізацыйныя працэсы развіваліся інтэнсіўна і ахапілі 19 раёнаў Віцебскай вобласці[1]. З адзначанай вышэй агульнай колькасці было закрыта 47 бібліятэк (у асноўным сельскіх) і 11 бібліятэк-клубаў. Найбольшыя змены адбыліся ў Віцебскім (-8), Браслаўскім, Глыбоцкім і Полацкім (-7) раёнах. Да клубнай сістэмы шляхам аб'яднання і рэарганізацыі адышлі 10 бібліятэк. 19 бібліятэк пераўтвораны ў бібліятэкі-клубы, а 6 бібліятэк-клубаў сталі бібліятэкамі.

Абслугоўванне жыхароў маланаселеных і аддаленых населеных пунктаў вырашалася арганізацыяй пазастацыянарных форм, прадстаўленых кніганошаствам, пунктамі выдачы літаратуры і бібліобусамі.

Па выніках 2014 года ў 17 раёнах Віцебскай вобласці дзейнічала **173** бібліятэчныя пункты (-17 да 2013 г.). На тэрыторыі вобласці функцыянавала **18** бібліобусаў, паслугамі якіх былі ахоплены жыхары 445 вёсак. Зона абслугоўвання кожнага з бібліобусаў у сярэднім складала 26 населеных пунктаў. Найбольшая колькасць вёсак, узятых на абслугованне мабільнымі бібліятэкамі, прыйшлася на Браслаўскі (62), Шумілінскі (57) і Сенненскі (55) раёны. Усяго было зроблена **1246** выездаў. Чытачамі мабільных бібліятэк сталі больш за **6,1** тыс. чалавек, кнігавыдача склала больш за **120,8** тыс. экзэмпляраў. Пытанне аб набыцці перасоўных бібліятэк яшчэ неабходна вырашыць у Міёрскім, Пастаўскім і Ушацкім раёнах.

[1] Гл. У дадатках Табліца № 1. Сетка публічных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2014 годзе.

Работа бібліобусаў па аслугоўванні маланаселеных і аддаленых вёсак ажыццяўлялася пасродкам традыцыйных форм масавай работы: ладзіліся кніжныя выставы і прэс-агляды «Духоўны свет літаратуры» (Лёзненская РЦБС), «Па старонках часопісаў» (Браслаўская РЦБС), гутаркі «Ваши семейные традиции» (Гарадоцкая РЦБС), «Теплые слова солдату» (Верхнядзвінская РЦБС), літаратурныя гадзіны «Вайной параненыя сэрцы», «Чытаем беларускую кнігу» (Віцебская РЦБС) і інш.

Практыкаваліся сумесныя выезды супрацоўнікаў бібліобуса і аўтаклуба (Браслаўскі, Віцебскі, Лепельскі раёны). Напярэдадні Дня Перамогі Віцебская цэнтральная раённая бібліятэка правяла акцыю па абслугоўванні жыхароў в. Дыманова «Мабільная кніга і віншаванне ветэрану», а на працягу года – «Кніжнае турнэ» па розных населеных пунктах раёна з удзелам карэспандэнтаў газет «Жыццё Прыдзвіння» і «Витебские вести». У выніку за справаздачны год аб рабоце бібліобуса было размешчана 5 публікацый у друку.

Сярод праблем пазастацыянарнага абслугоўвання спецыялісты бібліятэк адзначаюць:

– скарачэнне колькасці жыхароў аддаленых вёсак і павелічэнне колькасці людзей сталага ўзросту (маюцца вёскі па 1–3 жыхары з узростам больш за 70 год, дзе эфектыўнасць бібліятэчнага абслугоўвання нізкая);

– нерэгулярнае выдзяленне бібліобуса на абслугоўванне маршрутаў;

– тэхнічнае аснашчэнне бібліобуса (для найбольш эфектыўнага і якаснага абслугоўвання насельніцтва неабходна наяўнасць партатыўных камп'ютараў, капіравальнага апарата і інш.).

У адпаведнасцю з даручэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.10.2011 № 05/206-33 у вобласці працягваў дзейнічаць эксперымент па аб'яднанні публічных і школьных бібліятэк, размешчаных у сельскай мясцовасці. Аб'яднанне адбывалася згодна плана паэтапнай інтэграцыі ў 2012–2014 гг., распрацаванага аблвыканкамам і Метадычнымі рэкамендацыямі, зацверджанымі ў 2012 г. Міністэрствам культуры і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Працэсы інтэграцыі закранулі Браслаўскі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Лепельскі, Расонскі і Ушацкі раёны.

Усяго на працягу года з'явілася **9** новых інтэграваных бібліятэк, якія па ведамаснай прыналежнасці захаваліся за Міністэрствам культуры. З іх 2 бібліятэкі размешчаны ва ўстановах адукацыі: Дрысвяцкая бібліятэка-філіял № 52 (Браслаўскі раён) – на базе сярэдняй школы, Ляхаўская бібліятэка-філіял № 12 (узнавіла дзейнасць пасля трохгадовага перапынку, Дубровенскі раён) – на базе дзіцячай пачатковай школы-сада. Эканамічны эфект ад аб'яднання атрымалі аддзелы адукацыі ў сувязі са скарачэннем артыкула расходаў на ўтрыманне бібліятэк.

Пачынаючы з 2012 года, у 10 раёнах Віцебскай вобласці створана 21 інтэграваная ўстанова[2].

[2] Табліца 2. Паказчыкі дзейнасці інтэграваных бібліятэк Віцебскай вобласці ў 2014 годзе.

Прадстаўнікі дзевяці раёнаў Віцебскай вобласці прымалі ўдзел у абласных навуковых чытаннях маладых бібліятэкараў *«Пошукавая і даследчая дзейнасць бібліятэк»*, што адбыліся ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна ў кастрычніку.

Наведванне сельскіх бібліятэк – адна з дзейных форм метадычнай дапамогі. На працягу ўсяго года падчас выездаў у філіялы адбываецца знаёмства з іх работай, аказваецца метадычная і практычная дапамога. З мэтай павышэння кваліфікацыі сельскіх бібліятэкараў праводзіліся выязныя семінары: *«Сельская бібліятэка: ідэі, падыходы, рашэнні»* (на базе Язненскай сельскай бібліятэкі Міёрскай ЦБС), *«Сельская бібліятэка сёння: пошук уласнага іміджу»* (на базе Кіраўскай сельскай бібліятэкі Віцебскай РЦБС) і інш.

Асобнае месца ў справе ўдасканалення прафесійнага майстэрства, павышэння творчага патэнцыялу бібліятэкараў займаюць прафесійныя конкурсы. Традыцыйным стаў удзел бібліятэк у штогадовым рэспубліканскім конкурсе *«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»,* па выніках якога работа Дабейскай сельскай бібліятэкі Шумілінскай ЦБС узнагароджана другой прэміяй, а Дубровенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі – трэцяй прэміяй.

Важным інструментам для ажыўлення дзейнасці бібліятэк застаюцца і раённыя конкурсы (на напісанне гісторыі бібліятэк *«Гэта наша з табой біяграфія»* Шумілінскай ЦБС; на лепшую электронную прэзентацыю «*Гарадоччына – край баявой славы*» сярод бібліятэк аграгарадкоў Гарадоцкага раёна; па зборы фотадакументальнага матэрыялу аб Вялікай Айчыннай вайне *«Памяць вогненных гадоў»* Сенненскай ЦБС; на лепшую выставу да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў *«Беларусь гераічная»* Пастаўскай сеткі бібліятэк; конкурс рукапісных кніг «*Ствараем кніжкі самі»* сярод бібліятэк Аршанскай ЦБС; агляд-конкурс творчых бібліятэчных праектаў, прысвечаны 1040-годдзю са дня заснавання Віцебска *«Родны горад учора, сёння, заўтра»* Віцебскай ГЦБС і інш.). Конкурсы на лепшае афармленне і арганізацыю бібліятэчнай прасторы, інтэр'еру прайшлі ў трох раёнах: Віцебскім, Гарадоцкім, Докшыцкім.

Традыцыйна на пачатку года праводзяцца круглыя сталы, дзе падводзяцца вынікі работы бібліятэк сістэмы за мінулы год, вынікі конкурсаў па бібліятэчнай справе, адбываецца абмен вопытам, акрэсліваюцца перспектывы развіцця. Рэгулярна праходзяць вытворчыя нарады, на якіх адбываецца знаёмства з афіцыйнай дакументацыяй, новай метадычнай літаратурай, даюцца кансультацыі па асобных пытаннях работы. Актуальныя пытанні, прыярытэтныя накірункі дзейнасці бібліятэк разглядаюцца на пасяджэннях Саветаў пры дырэктары і пасяджэннях Саветаў аддзелаў культуры.

Працягвалі сваю місію ў дапамогу прафесійнай адукацыі і інавацыйныя формы работы, якія ўжо ўкараніліся ў практыку многіх раёнаў. Так, у Бешанковічах дзейнічае *«Школа пачынаючага бібліятэкара»* і клуб бібліятэкараў *«Сустрэча»,* у Гарадку не першы год існуе міні-праект *«Прафесійныя сустрэчы»,* у Дуброўна – школа

МЕТАДЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК

Мелькіна Н.А.,
галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства
ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

Метадычная дзейнасць бібліятэк вобласці ў 2014 годзе працягвала развівацца па асноўных накірунках: садзейнічанне дзяржаўнай культурнай палітыцы; арганізацыйна-кансультацыйная, даследчая дзейнасць; бесперапынная адукацыя бібліятэчных работнікаў; укараненне інавацый. Спецыялісты метадычных служб знаходзіліся ў пастаянным пошуку новых форм і метадаў навукова-метадычнага забеспячэння, адпавядаючых сучаснасці і ўдасканальваючых дзейнасць бібліятэк.

Абавязковай састаўляючай метадычнай работы з'яўляецца павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк, самай распаўсюджанай формай якога па-ранейшаму застаюцца семінары. Такія мерапрыемствы накіраваны не толькі на непасрэднае атрыманне новых ведаў і навыкаў, але і на пашырэнне кругагляду работнікаў, а таксама на развіцце арганізацыйнай культуры, навучанне і павышэнне кваліфікацыі ў працэсе работы.

З нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў былі праведзены тэматычныя семінары ў многіх раёнах. Так, у Браслаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся семінар бібліятэчных работнікаў на тэму *«Роля бібліятэкі ў патрыятычным выхаванні моладзі і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны»,* у рабоце якога прынялі ўдзел супрацоўнікі райвыканкама. На базе Межанскай бібліятэкі сямейнага чытання Гарадоцкай ЦБС прайшоў выязны семінар *«Вайны свяшчэнныя старонкі навекі ў памяці людской»*, прысвечаны рабоце публічных бібліятэк па папулярызацыі твораў беларускага пісьменніка В. Быкава і фарміраванню героіка-патрыятычнай свядомасці сярод розных катэгорый насельніцтва, Докшыцкая цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала семінар *«Старонкі той страшнай вайны».*

Эфектыўнымі з'яўляюцца семінары-практыкумы, якія аб'ядноўваюць і творчыя заданні, і абмен вопытам. На семінары-практыкуме *«Актуальныя пытанні бібліятэчнай работы»* павышалі сваё прафесійнае майстэрства супрацоўнікі Шумілінскай раённай сеткі бібліятэк. Былі праведзены семінары *«Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва: праблемы, пошукі, навацыі» (*Ушацкі р-н*), «Паспяховае планаванне – фактар эфектыўнай дзейнасці бібліятэкі», (Чашніцкі р-н).* У Браслаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся семінар *«Бібліятэка як фактар захавання нацыянальнай культуры і краязнаўства»*, які стаў фінальнай кропкай маштабнай бібліятэчнай кампаніі – раённых бібліятэчных краязнаўчых чытанняў *«Браслаўская гісторыя: падзеі, факты, асобы».*

Асноўныя прычыны скарачэння сеткі публічных бібліятэк

1. Сацыяльна-дэмаграфічны фактар: змяншэнне колькасці насельніцтва (у асноўным у сельскай мясцовасці), змена месца фактычнага пражывання (міграцыя, пераважна, моладзі ў найбольш буйныя населеныя пункты).

Паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі за апошнія пяць год колькасць жыхароў Віцебскай вобласці ў сельскай мясцовасці скарачаецца ў сярэднім на 4,6%. Для захавання агульнадаступнасці, тэмп скарачэння бібліятэк не павінен быць вышэй за тэмп скарачэння колькасці сельскіх жыхароў (4,6 % у год).

На сённяшні дзень сітуацыя выглядае наступным чынам: тэмп скарачэння колькасці бібліятэк вобласці пераўзыходзіць скарачэнне колькасці насельніцтва ў сярэднім на 7,8 %.

Табліца 1

Віцебская вобласць.
Дынаміка стану сеткі бібліятэк і колькасці сельскага насельніцтва

	2010	**2011**	**2012**	**2013**	**2014**
Колькасць бібліятэк	654 (-12)	635 (-19)	622 (-13)	600 (-22)	532 (-68)
Колькасць насельніцтва, тыс. чал.	1229,4 (-8,1)	1221,8 (-7,6)	1214,1 (-7,7)	1208,0 (-6,1)	1202,1 (-5,9)
У т.л. сельскага, тыс. чал.	330,3 (-11,1)	318,8 (-11,5)	305,7 (-13,1)	297,8 (-7,9)	290,1 (-7,7)

Табліца 2

Насельніцтва Віцебскай вобласці па ўзроставых групах. 2014 год



Сістэматычнае зніжэнне колькасці сельскіх жыхароў не толькі вызывае скарачэнне бібліятэк, утрыманне якіх становіцца эканамічна нямэтазгодным, але і ўплывае на працэсы аптымізацыі бібліяэчнага абслугоўвання. Старэнне насельніцтва і нізкая шчыльнасць сельскіх

населеных пунктаў пашыраюць зоны бібліятэчнага абслугоўвання, але людзей сталага ўзросту (а гэта катэгорыя даволі значная) ўсё больш складаней прыцягнуць да кнігі і чытання.

2. Аптымізацыя ўстаноў культуры шляхам аб'яднання і інтэграцыі згодна «Плана оптимизации в сети организаций культуры, их штатной численности, выполняемых ими функций» (зацверджаны Міністэрствам культуры ад 07.02.2014).

Сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя з'яўляецца адной з прычын правядзення аптымізацыі як галоўнага вектара кіравання сацыяльна-культурнай сферай, які прадугледжвае зніжэнне нагрузкі на бюджэт.

Агульныя лічбы па аптымізацыі ў вобласці мы прывялі вышэй. Адзначым яшэ раз, што ў мінулым годзе створана 9 інтэграваных бібліятэк, 10 бібліятэк перайшлі да клубнай сістэмы, а 19 бібліятэк сталі бібліятэкамі-клубамі. Цяжка казаць аб эканамічнай выгадзе, але стварэнне камбінаваных устаноў прадугледжвае паглыбленую змястоўную дзейнасць. Важнейшы накірунак работы такой установы – фарміраванне адзінай культурнай прасторы, асновай для стварэння якой з'яўляецца трывалая матэрыяльна-тэхнічная база і кам'ютарызацыя ўсіх працэсаў. А яшчэ… кваліфікаваныя кадры.

Хочацца спадзявацца, што пераўтварэнні, якія адбыліся ў рэгіёне, не будуць зведзены да механічнага аб'яднання, ды і новы час патрабуе новыя сацыяльныя ролі.

Паказчыкі дзейнасці

Эфектыўнасць работы бібліятэк непасрэдна звязана з колькасцю наведванняў і яе карыстальнікамі.

Адзначым, што асноўныя планавыя паказчыкі дзейнасці[3] бібліятэк па вобласці ў 2014 годзе выкананы. План па колькасці чытачоў выкананы на 100 %, кнігавыдача – на 104 %, наведванні – на 121 %. Да паслуг бібліятэк звярнулася **549,7** тыс. карыстальнікаў (-21,4 да 2013), якім было выдадзена **1072,1** тыс. экз. (-391,9 да 2013) дакументаў. Наведванні склалі **4708,4** тыс. разоў (+634,2 да 2013).

Для параўнання прывядзём лічбы па рэспубліцы.

Вобласць	колькасць бібліятэк	аб'ём фонду	колькасць чытачоў	колькасць наведванняў
Брэсцкая	548 (-35)	8960,4 (-302,7)	501,8 (-6,6)	4075,0 (+261,2)
Віцебская	**532** (- 68)	**8011,8** (-401,1)	**549,7** (-21,4)	**4708,4** (+634,2)
Гомельская	604 (-27)	9040,3 (-493,6)	547,3 (-10,5)	4686,2 (+581,5)
Гродзенская	340 (-28)	7779,3 (-412,6)	456,6 (-11,7)	3660,3 (+77,5)
Магілёўская	446 (-34)	8025,3 (-321,4)	438,4 (-29,7)	3885,5 (-19,8)
Мінская	488 (-202)	7727,5 (-1533,0)	543,1 (-54,4)	3970,5 (-51,4)

[3] Табліца 3. Асноўныя паказчыкі дзейнасці бібліятэк за 2014 год.

працягваюць супрацоўнічаць са школьнымі лагерамі з мэтай арганізаваць вольны час дзяцей, зрабіць яго больш разнастайным, актыўным, актывізаваць чытанне дзяцей падчас канікул.

Бібліятэкі вобласці актыўна працуюць з дзіцячымі садкамі, каб выхаваць сапраўдных будучых чытачоў. Шмат увагі надаецца рабоце з дзецьмі з праблемных сем'яў, сацыяльных прыютаў, інтэрнатаў для дзяцей з затрымкай псіхафізічнага развіцця, з аслабленым зрокам. Для іх праводзяцца мерапрыемствы, ладзяцца святочныя прадстаўленні.

Напрыклад, дзіцячая бібліятэка імя Я. Коласа Віцебскай ГЦБС працуе ў межах сумеснага плана работы з Віцебскім дзяржаўным гарадскім сацыяльна-педагагічным цэнтрам, для выхаванцаў якога праводзяцца масавыя мерапрыемствы, дабрачынныя акцыі па перадачы для дзяцей рэчаў і школьных прылад. Дзіцячая бібліятэка імя М. Лынькова працуе па праграме «Ад сэрца да сэрца» (для дзяцей з аслабленым слыхам), бібліятэка імя М. Астроўскага па праграме «Асобыя дзеці», у межах якой праходзяць пасяджэнні клуба «Востраў надзеі».

Цікавым з'яўляецца вопыт партнёрства дзіцячай бібліятэкі імя Я. Журбы Чашніцкай ЦБС па абслугоўванні дзяцей з сацыяльнага прытулку. На працягу года яго выхаванцы змаглі прыняць удзел у гісторыка-краязнаўчым падарожжы «З любоўю да роднага краю», пазнавальна-гульнёвай праграме «Не ўсё Стральцу – яблычак» і інш.

У Полацку дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 імя Л. Талстога прадоўжыла работу з дашкольнікамі і іх бацькамі па праекце «Растим читателя вместе» і паспрабавала зацікавіць дзіцячымі кнігамі і кнігамі па развіцці дзяцей будучых матуль, якія наведваюць жаночую кансультацыю, і бацькоў, чые дзеці наведваюць дзіцячы садок № 17.

У бібліятэках Аршаншчыны працавалі па сумесным праекце са школамі горада, які ўключыў комплекс мерапрыемстваў, скіраваных на прыцягненне падрастаючага пакалення да чытання. У дзіцячых бібліятэках прайшлі экскурсіі, культурна-забаўляльныя праграмы «Читающие дети – читающая страна», тэатралізаваныя святы-прысвячэнні ў чытачы «Праздник книжкиных друзей».

Сёння бібліятэкары выкарыстоўваюць усе формы індывідуальнай і масавай работы для прыцягнення дзяцей да чытання, арганізоўваюць аматарскія аб'яднанні і клубы, лялечныя тэатры. У арсенале бібліятэк назіраецца вялікая разнастайнасць формаў: гутаркі з дзецьмі і падлеткам (пры запісе ў бібліятэку, рэкамендацыйныя, «аб прачытаным» і г. д.), сумесная падрыхтоўка творчых выставак, масавых мерапрыемстваў, заахвочванне лепшых чытачоў (бенефісы, конкурсы, узнагароджанне самых чытаючых у Тыдзень дзіцячай кнігі, гучныя чытанні і інш.). У друкаваных выданняў шмат канкурэнтаў: тэлебачанне, камп'ютар, але кніга па-ранейшаму неабходна, яна адкрывае дзіцяці свет, вучыць спачуваць, радавацца, выхоўвае. Інтэрнэт, e-mail, лакальная сетка – чарговы інструмент, які дапамагае вырашыць праблему папулярызацыі чытання новымі і сучаснымі метадамі.

часопісаў, гадзіны этыкету і здароўя, брэйн-рынгі і інтэлектуальныя гульні.

Бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай Віцебскай ГЦБС для дзяцей і бацькоў рэалізавала літаратурна-забаўляльную праграму «Кніжкі чытай – свет пазнавай». Адкрылі свята вулічнай акцыяй удзельнікі валанцёрскай групы «Доктор Неболит». У залах бібліятэкі чытачам былі прапанаваны цікавыя літаратурныя віктарыны з уручэннем прызоў пераможцам, выстава дзіцячага малюнка «Сонечны свет», кніжны лабірынт, агляд новай дзіцячай літаратуры «Кніжны сусвет», майстар-клас па арыгамі і пляценні ўпрыгожванняў з нітак.

Бібліятэкі Лепельскай ЦБС правялі свята «Страна по имени Детство» (дзіцячая бібліятэка), забаўляльную праграму «По дорогам сказки», літаратурную латарэю «Все книжки в гости к нам», стварылі буктрэйлер «Волшебное слово из шкатулки».

Найбольш цікавымі і запамінальнымі для чытачоў Полацкай ЦБС былі сустрэча з юнымі паэтамі «Когда приходит вдохновенье», літаратурнае падарожжа «Краіна любімых герояў», завочная сустрэча з пісьменнікам-земляком «Розныя казкі Пятра Васючэнкі» і інш.

З пачаткам **школьных канікул** у бібліятэках узялі старт праграмамы летніх чытанняў: «Лета. Кніга. Адпачынак» (Пастаўская ЦБС), «Лето книжное, будь со мной!» (Гарадоцкая ЦБС), «У кніг не бывае канікул» (Браслаўская ЦБС).

Шмат было праведзена мерапрыемстваў у рамках рэспубліканскай акцыі «Лета з добрай кнігай», сярод іх: чытацкі марафон «Пусть чтение зажигает сердца» (Віцебская ЦРБ), конкурс малюнкаў «Вот оно какое наше лето» (Полацкая ЦБС), забаўляльная праграма «Калі на планеце гаспадары – дзеці» (Чашніцкая ЦБС).

Супрацоўнікі бібліятэк і чытачы прынялі ўдзел у акцыях: «Растем вместе с книгой» (Шумілінская раённая дзіцячая бібліятэка), «Читать – это модно!» (Верхнядзвінская ЦРБ), «Хотите читайте сами, но лучше вместе с нами!», «Скоро в библиотеку» (бібліятэкі Наваполацкай ГЦБС), «Подари ребёнку книгу – подари ребёнку мир» (бібліятэка-філіял № 7 Полацкой РЦБС).

У верасні, падчас святкавання Тыдня бібліятэк, прайшлі ўрачыстыя цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў летніх чытанняў – ім былі ўручаны дыпломы, граматы і памятныя падарункі.

Бібліятэкі працягваюць наладжваць актыўнае **сацыяльна-культурнае партнёрства** паміж установамі культуры, адукацыі, спорту, грамадскімі арганізацыямі і рухамі.

Не першы год ЦГДБ імя А. Гайдара супрацоўнічае з Віцебскім абласным цэнтрам прафесійнай арыентацыі моладзі, юнацкім клубам «Юность», гарадскім цэнтрам дзіцячай творчасці, дзіцячай музычнай школай № 5. У межах сумесных планаў работы ладзяцца музычныя вечарыны, трэнінгі, арганізаваны выставы творчых работ «Свята душы», «Зімовая казка», «Зімовы настрой» і інш.

Бібліятэкі Гарадоцкай ЦБС, Докшыцкай ЦБС, Чашніцкай ЦБС

Агульнае зніжэнне колькасці карыстальнікаў і кнігавыдач тлумачыцца, безумоўна, дэмаграфічнай сітуацыяй, ростам камп'ютарызацыі насельніцтва і даступнасцю інфармацыі ў сетцы інтэрнэт.

Сярод асноўных фактараў, якія ўплываюць на развіццё сучаснай бібліятэкі рэгіёна (і як вынік – на яе карыстальнікаў), можна адзначыць:

– незбалансаванасць узроўню развіцця розных відаў матэрыяльна-тэхнічнай базы;

– нестабільнасць забеспячэння рэсурсамі;

– нізкі ўзровень прапаноў дыстанцыйнага бібліятэчнага абслугоўвання;

– дэфіцыт матэрыяльных, фінансавых рэсурсаў.

Адносна паказчыкаў дзейнасці заўважым, што значнае зніжэнне колькасці чытачоў адбылося ў Віцебскім (-3975), Лепельскім (-2084), Браслаўскім (-772) раёнах. Даная сітуацыя напрамую звязана са скарачэннем сеткі бібліятэк.

Колькасць наведванняў у параўнанні з 2013 годам павялічылася на 634 298 тыс. (15,6 %) і дасягнута за кошт увядзення ў дзяржаўную статыстыку паказчыка «аддаленыя карыстальнікі». Такім чынам, адпаведна Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады ў вобласці забяспечана выкананне паказчыка «Павелічэнне колькасці наведванняў бібліятэк, у тым ліку аддаленых карыстальнікаў, на 5 % да 2015 года».

Што датычыцца адносных паказчыкаў работы, то ў цэлым па вобласці, яны нязначна выраслі.

Чытальнасць (характарызуе ступень выкарыстання кніжнага фонду) – **19,5** (у 2013 – 19,4), абарачальнасць (характарызуе інтэнсіўнасць чытання) – **1,3** (у 2013 – 1,3), наведвальнасць (характарызуе актыўнасць наведванняў) – **8,5** (у 2013 – 7,1).

Самай высокай чытальнасці дасягнулі Лепельская (23,1), Расонская (21,6), Чашніцкая (21,5) ЦБС, самай нізкай – Полацкая (18,3), Талачынская ЦБС і г. Віцебск (18,0).

Высокі ўзровень абарачальнасці змаглі забяспечыць г. Віцебск (1,9), Шумілінская (1,8), Дубровенская (1,6) ЦБС. Менш за сярэдні паказчык (і нават за 1,0) у Міёрскай, Шаркаўшчынскай, Ушацкай (0,9), Расонскай, Верхнядзвінскай (0,8) і Дубровенскай (0,7) ЦБС.

Найбольшая наведвальнасць у Віцебскай абласной бібліятэкі – 19,3 (з улікам колькасці віртуальных наведванняў на афіцыйны сайт, дзе размешчаны ўласныя базы даных краязнаўчага зместу і электронныя версіі друкаваных выданняў). Наведвальнасць непасрэдных карыстальнікаў па выніках года склала – 4,8.

Высокіх паказчыкаў дасягнулі таксама Верхнядзвінская (13,3), Гарадоцкая (9,6 %), Шумілінская (8,9) ЦБС.

Працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем склаў **45,7** %.

Колькасць бібліятэчных работнікаў, якія ажыццяўлялі

бібліятэчнае абслугоўванне па вобласці, склала **1307** чалевек, сярод якіх 471 спецыяліст з вышэйшай і 469 – з сярэдняй спецыяльнай бібліятэчнай адукацыяй.

Бібліятэчныя фонды

Па выніках работы за 2014 год нарматыў па камплектаванні бібліятэчных фондаў быў выкананы: на закупку розных відаў выданняў было накіравана **16807,1** млн. руб., што склала 15,4% ад аб'ёму фінансавання, выдзеленага на ўтрыманне публічных бібліятэк. Выкананне нарматыву дасягнулі практычна ўсе сістэмы, за выключэннем Ушацкай (14,8 %), Шаркаўшчынскай (13,9 %) і г. Віцебска, чый паказчык склаў 11,8 %. Лідарамі ў выкананні нарматыву сталі Аршанскі (16,9 %), Лепельскі (16,7 %) і Міёрскі (16,4 %) раёны. Віцебская абласная бібліятэка выканала нарматыў на 16,6 %.

Паступленне дакументаў на традыцыйных і электронных носьбітаў склала **374,9** тыс., выбыццё – больш за два разы (**776,1** тыс. экз.). Пры даведзеным 5 % нарматыве абнаўлення фондаў у рамках Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» абнаўленне фондаў бібліятэк па вобласці склала **4,7** % (у сярэднім па рэспубліцы 4,9 %). Самы высокі працэнт абнаўляемасці фондаў змаглі забяспечыць Лепельская (9,6 %), Чашніцкая (7,7 %) і Шумілінская (7,3 %) сістэмы, самы нізкі паказчык абнаўляемасці ў бібліятэк г. Віцебска і Віцебскага раёна.

Адной са значных крыніц папаўнення фондаў заставаліся дары – арганізацый, устаноў, прыватных асоб. Ва ўсіх сістэмах публічных бібліятэк вобласці прайшлі традыцыйныя акцыі «Падары бібліятэцы кнігу», вынікам якіх з'явілася перадача ў бібліятэкі мастацкай, вучэбнай, навукова-папулярнай літаратуры. У справаздачным годзе ў дар атрымана **16299** экз., што складае 4,3 % ад агульнай колькасці дакументаў, якія паступілі ў бібліятэку.

Трэба адзначыць, што публічнымі бібліятэкамі правадзіліся акцыі па зборы кніг не толькі для карыстальнікаў бібліятэк, але і для сацыяльных прытулкаў, дзіцячых дамоў, устаноў адукацыі і аховы здароўя. Адзначым дабрачынныя акцыі «Книга через всю жизнь» для дзяцей Віцебскага абласнога Дома дзіця, «Читающие дети – читающая страна» для Віцебскай дзіцячай абласной клінічнай бальніцы (Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна), дабрачынны марафон «Книгу – в подарок» для аддзялення сястрынскага догляду Наваполацкай цэнтральнай бальніцы (бібліятэка імя У. Караткевіча), акцыю «Подари ребенку книгу – подари ребенку мир» (рэалізавана ў рамках праграмы «Лучик доброты» бібліятэкай-філіялам № 7 Полацкай РЦБС).

На працягу года фонды бібліятэк папаўняліся выданнямі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага Экзархата, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і інш.

Асобай падзеяй у культурным жыцці Віцебшчыны стала перадача ў дар бібліятэкам вобласці ўнікальных выданняў з праекта «Книжное наследие Франциска Скорины» (першымі пяццю ўзноўленымі тамамі з

Вядучым напрамкам дзейнасці бібліятэк заставалася **краязнаўства**.

Усе без выключэнння бібліятэкі засяродзілі сваю ўвагу на рабоце па **адраджэнні духоўнай культуры**, **прапагандзе беларускай літаратуры і мовы, беларускай спадчыны**.

Многія з дзіцячых бібліятэк працавалі па **мэтавых праграмах**.

Дзіцячая раённая бібліятэка Докшыцкай ЦБС актыўна працягвае работу па праграме «ЛУЧ» (лучшее учение – чтение), асноўная мэта якой – прапаганда мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, далучэнне дзяцей да агульначалавечых каштоўнасцей праз кнігу. У рамках праграмы праведзены літаратурная віктарына «Юбілей у пісьменніка – свята ў чытача», турнір кнігачэяў «Мы раскажам без сакрэтаў, што чыталі гэтым летам» і інш.

Дзейнасць Расонскай ЦБС прадстаўлена праграмай «Дашкольнік. Кніга. Бібліятэка», Чашніцкая гарадская бібліятэка працуе па экалагічнай праграме «Беражы свой дом – сваю планету», бібліятэкі Віцебскай ГЦБС – па праграмах «Нам засталася спадчына», «Усё пачынаецца з сям'і», «Увайсці ў свет прыгажоці», «Асобыя дзеці».

У рамках **прававой асветы** бібліятэкары Гарадоцкай дзіцячай бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел у агульнагарадскім свяце «Детством город наш обнимем», Прудніцкая бібліятэка арганізавала гадзіну прававой інфармацыі «Я – грамадзянін сваёй дзяржавы», інтэлектуальна-прававую гульню «Знаешь ли ты право?», Бычыхінская бібліятэка правяла свята дзяцінства «Солнце детям подарите».

Цэнтр прававой інфармацыі для дзяцей і падлеткаў дзіцячай бібліятэкі імя Л. Талстога-філіяла № 1 Полацкай ЦБС працаваў па праграмах «Расти в безопасности» (для малодшых школьнікаў) і «Закон изучают дети» (для вучняў сярэдніх і старэйшых класаў).

Бібліятэкамі надавалася ўвага **маральна-духоўнаму выхаванню** дзяцей і падлеткаў, далучэнню іх да духоўных каштоўнасцяў праз хрысціянскія традыцыі.

У Чашніцкай гарадской бібліятэцы да Дня беларускага пісьменства і друку была прымеркавана сустрэча «Духовных книг божественная мудрость».

Да 50-гадовага юбілею горада Новалукомля дзіцячая бібліятэка прыняла ўдзел у праваслаўным праекце «Добрае кіно», які прадугледжваў прагляд кінастужак і правядзенне духоўных гутарак са святарамі Свята-Елісавецінскага манастыра горада Мінска.

Тэме **здаровага ладу жыцця** быў прысвечаны шэраг мерапрыемстваў: гадзіна прафілактыкі шкодных звычак «Не – тытуню, алкаголю, наркотыкам!» (Латыгаліцкая сельская бібліятэка Сененнскай ЦБС), тэатралізаванае прадстаўленне «Планета здароўя», забаўляльна-пазнавальная праграма «О спорт! Ты – мир!» (Чашніцкая ЦРБ) і інш.

Традыцыйна ў шэрагу бібліятэк прайшоў **Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі**. Праграмы Тыдня былі напоўнены мерапрыемствамі розных формаў: літаратурныя падарожжы і калейдаскопы, прэм'еры кніг і

РАБОТА БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ З ДЗЕЦЬМІ І ПАДЛЕТКАМІ

Сёмкін А.І.,
вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства
ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

На 01.01.2015 года ў Віцебскай вобласці дзейнічаюць 36 дзіцячых бібліятэк (-3 да мінулага года), якія уваходзяць у сетку дзяржаўных публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. З іх: 18 раённых, 15 гарадскіх і 3 гарпасялковыя дзіцячыя бібліятэкі.

У выніку аптымізацыі рашэннем Полацкага райвыканкама ад 29.08.2014 г. № 1451 закрыты дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 і бібліятэка-філіял № 7 у Полацку, дзіцячая бібліятэка г.п. Езярышча (Гарадоцкі раён) аб'яднана з Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкай згодна рашэння райвыканкама ад 31.07.2014 г. № 620.

Асноўнымі накірункамі ў рабоце з дзіцячым чытачом усіх бібліятэчных сетак у справаздачным годзе былі:

- распаўсюджванне гісторыка-краязнаўчых, эстэтычных, экалагічных і прававых ведаў;
- прапаганда беларускай культуры, мовы і літаратуры;
- прафарыентацыя падлеткаў;
- арганізацыя вольнага часу і сямейнага адпачынку.

Аналіз статыстычных справаздач сведчыць аб змяншэнні колькасці наведвальнікаў, што звязана са скарачэннем колькасці насельніцтва як у сельскіх населеных пунктах, так і раённых цэнтрах, змяншэннем колькасці навучэнцаў у зоне абслугоўвання, закрыццём школ у сельскай мясцовасці. Тым не менш, шэраг бібліятэчных сістэм могуць адзначыць рост чытачоў, сярод іх Наваполацкая, Полацкая, Чашніцкая ЦБС.

Традыцыйна, па **патрыятычным выхаванні** работа бібліятэк вобласці ажыццяўлялася на працягу года.

Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў былі аб'яўлены акцыі: «Прачытаная кніга аб вайне – наш падарунак ветэранам» (Браслаўская ЦБС), «І маладзее горад мой сваёй гісторыяй багаты», «Крочым шляхам вызвалення» (Віцебская ГЦБС), «Чытаем дзецям аб вайне» (Чашніцкая ЦБС) і інш.

Для юных чытачоў былі арганізаваны і праведзены літаратурна-музычныя вечарыны, сустрэчы з малалетнімі вязнямі, ветэранамі, сведкамі вайны, гадзіны і ўрокі патрыятызму, памяці, гісторыі.

Дзяцячыя бібліятэкі г. Віцебска бралі актыўны ўдзел у гарадскім свяце кнігі, прысвечаным 1040-годдзю горада «Літаратурная палітра паўночнай сталіцы», і свяце, прымеркаваным да Дня Незалежнасці «Красуй наш горад сёння і заўжды». Бібліятэка імя А. Гайдара рэалізавала патрыятычны праект «Вайна ў лёсе маёй сям'і».

поўнага збору прац беларускага першадрукара: праект па факсімільным ўзнаўленні кніжнай спадчыны Скарыны быў рэалізаваны Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры фінансавай падтрымцы Банка БелВЭБ), а таксама факсімільнага выдання Тураўскага Евангелля (доўгатэрміновы праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і прадстаўніцтва кампаніі Xerox).

У ліпені 2014 года Віцебская абласная бібліятэка атрымала ў дар больш за 80 рукапісных партытур ад кіраўніка і дырыжора аркестра народных інструментаў дзіцячай школы мастацтваў № 2 г. Оршы Ігара Якаўлевіча Ласкутова. На галоўнай старонцы сайта бібліятэкі размешчаны віртуальны праект, які ўключае бібліяграфічныя спісы на нотны матэрыял, прадстаўлены ў калекцыі (аркестравыя версіі твораў айчынных і замежных кампазітараў, а таксама рускіх і беларускіх народных песень), забяспечаны доступ да часткі алічбаваных аўтарскіх рукапісаў.

У бягучым годзе ў вобласці былі закуплены кнігі павышанага попыту за фінансавыя сродкі, атрыманыя публічнымі бібліятэкамі ад пазабюджэтнай дзейнасці. Усяго зрасходавана **170,7** млн. руб., на якія набыта **2927** экз. дакументаў.

Агульнае паступленне літаратуры за кошт бясплатных крыніц камплектавання склала **29932** экз. дакументаў на суму **678,1** млн. руб (8 % ад набытых за год дакументаў).

Аўтаматызацыя. Матэрыяльна-тэхнічная база

Інфарматызацыя бібліятэк Віцебшчыны ажыццяўляецца згодна Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг., якая прадугледвае поўную камп'ютарызацыю бібліятэчных устаноў і штогоднае 20 %-нае абнаўленне кап'ютарнага парку.

На 01.01.2015 г. у вобласці камп'ютарызавана 343 публічныя бібліятэкі (64,4 %), сярод сельскіх – 59,3 %. За справаздачны год камп'юарны парк папоўніўся на 47 камп'ютараў (разам з падключэннем да сеткі інтэрнэт і электроннай поштай). Агульная колькасць камп'ютараў складае 955 адзінак. Абнаўленне камп'ютарнага парку – 4,9 %.

Колькасць бібліятэк, якія прадастаўляюць доступ да інтэрнэту павялічылася на 3,2 % і складае 252 бібліятэкі (47,4 %). Электронную пошту маюць 245 бібліятэк (46 %).

Самы нізкі працэнт камп'ютарызацыі ў Шаркаўшчынскім (47,6 %) і Аршанскім (48,9 %) раёнах. 100%-най кап'ютарызацыі дасягнулі сярод раённых – бібліятэкі Лёзненскага і Чашніцкага раёнаў, сярод гарадскіх – бібліятэкі г. Наваполацка.

Працягваецца работа па стварэнні і развіцці бібліятэчных сайтаў. Сярод сістэм, якім яшчэ неабходна распрацаваць уласныя сайты, адзначым Верхнядзвінскую, Дубровенскую і Ушацкую.

Галоўная задача па аўтаматызацыі бібліятэк – пераход на новае праграмнае забеспячэнне ALIS-Web – у Віцебскай вобласці выконваецца больш нізкімі тэмпамі, чым у рэспубліцы: на пачатак 2015 года набыта 7

пакетаў АБІС, сярод якіх устаноўлены і знаходзяцца ў эксплуатацыі ў поўным аб'ёме толькі аўтаматызаваныя сістэмы Віцебскай абласной бібліятэкі і Наваполацкай ЦБС. У тэставым рэжыме працуюць бібліятэкі Лепельскага, Аршанскага, Пастаўскага і Полацкага раёнаў, у Чашніцкім раёне набыта АБІС, але пакуль што не ўстаноўлена.

З мэтай павышэння камфортнасці і стварэння спрыяльных умоў для аказання бібліятэчных паслуг адбывалася мадэрнізацыя ўстаноў і ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Праведзены бягучы рамонт у 94 бібліятэках (17,6%).

Палепшылі свае ўмовы пераездам у новае памяшканне Дрысвяцкая бібліятэка-філіял № 52 Браслаўскай ЦБС, Стралкоўская бібліятэка-клуб Верхнядзвінскай ЦБС, Засценкаўская сельская бібліятэка Дубровенскай ЦБС.

На працягу справаздачнага года за бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі набывалася тэхнічнае абсталяванне. Закуплены сервер (для Браслаўскай ЦБ), 34 кап'ютары, 21 прынтар, 1 сканер, 5 ШФУ. За кошт спонсарскай дапамогі для бібліятэкі замежнай літаратуры Віцебскай ГЦБС набыты 6 камп'ютараў, акустычная сістэма, blu-ray прайгравальнік, ліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне, для Докшыцкай дзіцячай раённай бібліятэкі – тэлевізар, для бібліятэк Аршанскай сістэмы – 2 камп'ютары, прынтар Canon i-SENSYS, акустычная сістэма, лічбавая фотакамера, тэлевізар і інш.

Разам з тым, у 2014 годзе капітальны рамонт і рэканструкцыя цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк Віцебскай вобласці не праводзіўся, аднак капітальнага рамонту патрабуюць 5 бібліятэк: Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, будынкі цэнтральнай бібліятэкі імя У. Маякоўскага і бібліятэкі імя Я. Коласа Наваполацкай гарадской сеткі публічных бібліятэк, цэнтральная раённая бібліятэка Ушацкай ЦБС, а таксама бібліятэка аграгарадка «Райцы» Талачынскага раёна.

Без ацяплення знаходзяцца 3 сельскія бібліятэкі: Шунеўская (Глыбоцкі р-н), Хацілаўская (Пастаўскі р-н), Дубраўская (Ушацкі р-н).

У аварыйным стане знаходзіцца Чарневіцкая сельская бібліятэка Глыбоцкага раёна.

Усяго тэлефанізавана 394 бібліятэкі (74 %), не маюць уласнай сувязі 138 бібліятэк.

Узнагароды. Пераможцы конкурсаў

У студзені 2009 года рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта быў зацверджаны парадак прысваення ганаровага звання **«Чалавек года Віцебшчыны»**. І вось ужо шэсць год запар як у вобласці ўрачыста праходзіць цырымонія ўзнагароджання лепшых прадстаўнікоў розных прафесій і сфер дзейнасці. Званне прысвойваецца прадстаўнікам працоўных калектываў Прыдзвінскага краю, чые прафесіяналізм, працаздольнасць, мэтанакіраванасць, крэатыўны падыход сталі значным

укладам ва ўмацаванні сацыяльна-эканамічнай складаючай краіны, у захаванні духоўных каштоўнасцей.

Упершыню за адзначаны перыяд звання «Чалавек года Віцебшчыны» ўдастоены прадстаўнікі бібліятэчнай прафесіі. У намінацыі «Культура і мастацтва» званне атрымала дырэктар Віцебскай гарадской сеткі публічных бібліятэк *Данілава Галіна Георгіеўна*.

Па выніках 2014 года ў рамках калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і справах моладзі былі аб'яўлены вынікі абласной штогадовай прэміі **«За высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва»**.

У намінацыі «Лепшая раённая (гарадская) бібліятэка» прэмію атрымалі *Наваполацкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага* (дырэктар Н. Наважылава) і *Новалукомльская гарадская бібліятэка* Чашніцкай ЦБС (загадчык Н. Васілевіч).

У намінацыі «Лепшая дзіцячая бібліятэка» адзначана *Полацкая дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога* (загадчык З. Гуменік), а ў намінацыі «Лепшая сельская бібліятэка» – *Пруднікӑўская бібліятэка* Гарадоцкай ЦБС (бібліятэкар Л. Каржова).

Развіццю прафесійных кампетэнцый бібліятэкараў спрыяў штогодны ўдзел у конкурсе **«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»**.

Па выніках XXII Рэспубліканскага конкурсу ў намінацыі «За пошукавую і даследчую дзейнасць» лаўрэатам другой прэміі выступіла *Дабейская сельская бібліятэка Шумілінскай ЦБС*. Прадстаўленая на конкурс работы прадэманстравала паглыбленае вывучэнне вопыту і праблем развіцця бібліятэчнай справы ў гістарычным аспекце, праз прызму хронікі грамадскага і сацыяльна-палітычнага жыцця рэгіёна.

Рашэннем журы ў гэтай жа намінацыі лаўрэатам трэцяй прэміі стала *Дубровенская цэнтральная раённая бібліятэка* за створаны інфармацыйны рэсурс «Зніклыя старонкі Дубровенскага летапісу», які найбольш поўна звярнуўся да гістарычнага матэрыялу, прысвечанага вядомым людзям, важнейшым датам і падзеям, а таксама прычынам знікнення населеных пунктаў рэгіёна і ўключыў картаграфічныя дакументы, тэрміналагічны слоўнік, распрацаваны на аснове выяўленых дакументаў.

Заахвочвальныя прэміі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» атрымалі таксама *Лепельская цэнтральная раённая бібліятэка* і *Якубаўшчынская сельская бібліятэка Лёзненскай сеткі публічных бібліятэк*.

Віншуем пераможцаў!